153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36 3863.2

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦКі МККП(б)Б, ЦВКі СНК БССР

№ 296 (5670) | 27 снежня 1936 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

У мэтах забяспечання за грамадзянамі свабоды сумлення царква ў СССР аддзелена ад дзяржавы і школа ад царквы. Свабода правіць рэлігійныя культы і свабода антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі.

(З Канстытуцыі Саюза ССР)

СТАЛІНСКІЯ КЛОПАТЫ АБ КАЛГАСАХ

У ліку карэнных пачаткаў грамадскага ўстройства СССР Сталінская Канстытуцыя запісала: «Зямля, якая займаецца калгасамі, замацоўваецца за імі ў бясплатнае і бестэрміновае карыстанне, гэта значыць навечна». Згодна статута сельскагаспадарчай арцелі, які распрацован і прынят пры непасрэдным удзеле і кіраўніцтве таварыша **Сталіна,** ні ў якім разе не дапускаецца скарачэнне зямельных плошчаў калгасаў; па статуту арцелі дапускаецца толькі павелічэнне іх.

Партыя, совецкі ўрад і вялікі **Сталін** пастаянна клапоцяцца аб калгасах і калгасніках. Калгаснікам даецца крэдыт па пакупку кароў, прадастаўляюцца велізарныя крэдыты на калгаснае будаўніцтва і павелічэнне стада.

Ці можна толькі ў свеце назваць хоцьбы адну такую другую краіну, дзе ўрад таксама клапаціўся-б аб сваім народзе? Гэтага няма. Наадварот, з кожным годам становішча селяніна за граніцай становіцца ўсё горш і горш.

Совецкі ўрад праявіў новыя клопаты аб беларускім селяніне. Згодна пастановы Соўнаркома Саюза ССР, якая змешчана ва ўчарашнім нумары «Звязды», да калгасаў БССР прырэзаецца ад соўгасаў, гаспадарак ОРС'аў і падсобных гаспадарак розных арганізацый 144.588 гектараў. Такім чынам, калгасы Беларусі будуць мець у бясплатным і бестэрміновым карыстанні ўжо 7.063.349 гектараў зямлі.

Цяпер калгасы не толькі ўсё больш і больш паспяхова выконваюць дзяржаўныя планы пасеваў, незалежна ад працаёмкасці культур, але і перавыконваюць іх ва многіх мясцах і імкнуцца да пашырэння плошчаў, прыгодных для культурнага земляробства. Як ніколі, калгасы цэняць цяпер кожную часцінку зямельнай плошчы.

І зусім зразумела, чаму з такой клапатлівасцю і любоўю адносяцца калгаснікі да зямлі. «Цяпер селянін — забяспечаны гаспадар, член калгаса, які мае ў сваім распараджэнні трактары, сельгасмашыны, насенфонды, запфонды і т. д. і т. п.» (Сталін). Пашырэннем зямельнай плошчы і найлепшай яе апрацоўкай калгаснікі змагаюцца за хутчэйшае выкананне лозунга правадыра — «давесці штогодную вытворчасць зярна ў бліжэйшым будучым да 7—8 мільярдаў пудоў».

У сваёй прамове на першым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў таварыш Сталін сказаў: «Даволі толькі палепшыць скарыстанне машын і трактароў, даволі толькі палепшыць апрацоўку зямлі і мы даб'емся таго, што павялічым колькасць нашых прадуктаў удвое-ўтрое. А гэтага зусім досыць для таго, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі працаўнікамі калгасных палёў».

Гэтыя словы вялікага правадыра прагучэлі тады па ўсёй нашай неасяжнай краіне. Яны яркім маяком асвяцілі шлях у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за калгасную заможнасць.

З часу першага з'езда калгаснікаў-ударнікаў прайшло блізка каля чатырох год. За гэтыя гады калгасы дабіліся вялікіх поспехаў. Мы маем зараз па нашай рэспубліцы рад калгасаў, якія ў гэтым годзе, не гледзячы на неспрыяючыя кліматычныя ўмовы, дабіліся па 25—30 цэнтнераў з гектара зернавых, 8—10 цэнтнераў і нават больш ільновалакна і 250—300 цэнтнераў бульбы. Рад звенняў калгасаў Барысаўшчыны ўзялі па 500 цэнтнераў бульбы з гектара.

Расце вага працадня калгаснікаў. Такія калгасы, у якіх прыпадае сёлета на працадзень тры ці тры з паловай кілограмы зернавых, не рэдкі ўжо ў БССР. Напрыклад, у калгасе «Першае мая», Слуцкага раёна, калгаснікі атрымалі сёлета на працадзень каля чатырох кілограмаў збожжа. 13 кілограмаў бульбы і 2 руб. 50 кап. грашыма. Яшчэ больш атрымалі калгаснікі такіх сельгасарцеляў, як «Чырвоны партызан» і імя Сталіна, Менскага раёна, «Чырвоны бераг», Аршанскага раёна, некаторыя калгасы Копыльскага і іншых раёнаў.

Але хіба-ж можна супакоіцца на дасягнутым? Не, ні ў якім разе. Па нашай рэспубліцы шмат ёсць такіх калгасаў, у якіх яшчэ нізкая ўраджайнасць. Трэба дабіцца таго, каб у нашай ордэнаноснай рэспубліцы не было ніводнага адстаючага калгаса.

Скарачэнне зямель соўгасаў за лік ліквідацыі дробных соўгасаў, дзе дрэнна асвоена зямля, дасць магчымасць асноўнай масе соўгасаў лепш паставіць работу на адстаючай зямлі, яшчэ вышэй падняць у іх ураджайнасць, яшчэ больш даваць дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. Застаўшыяся соўгасы стануць яшчэ больш рэнтабельнымі.

Справа гонару калгасаў — паказаць узоры скарыстання тых зямель, якія ім прырэзваюцца ад соўгасаў.

На сталінскія клопаты калгаснікі павінны адказаць яшчэ больш настойлівай, большэвіцкай працай у барацьбе за высокі ўраджай, за мноства прадуктаў для нашай краіны. Добраякасная падрыхтоўка і правядзенне палыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі з'яўляецца баявой задачай сёнешняга дня для кожнага калгаса і калгасніка.

Поўнасцю засыпаць, ачысціць і праверыць на ўсхожасць усё насенне, своечасова і добраякасна адрамантаваць сельскагаспадарчыя машыны і інвентар, падрыхтаваць рабочую жывёлу да выхаду ў поле, забяспечыць яе кармамі, — вось што патрабуецца зараз ад кожнага калгаса.

Разгорнем соцыялістычнае спаборніцтва за лепшую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы. Шырэй стаханаўскі рух за сталінскі ўраджай!

Узброіўшыся сталінскім статутам сельскагаспадарчай арцелі і новай Сталінскай Канстытуцыяй, даб'емся новых перамог у соцыялістычнай сельскай гаспадарцы.

ЗАКЛІК ПЕРАДАВЫХ ЖАНЧЫН

Закончылася выдатная нарада выдатных жанчын. Учора ў «Звязде» быў апублікаван зварот усесаюзнай нарады жонак камандзіраў і начальніцкага складу РСЧА да ўсіх жанчын, мацярэй, сёстраў каманднага складу Чырвонай Арміі, да ўсіх жанчын Совецкага Саюза. Сёння мы друкуем заключную прамову народнага камісара абароны — маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава на закрыцці нарады. Гэтыя два дакументы завяршаюць работу выдатнай нарады лепшых прадстаўнікоў вялікай арміі жанчын нашай краіны.

6 дзён цягнулася гэта нарада. Жанчыны расказвалі аб сваёй дапамозе мужам, аб сваёй рабоце, аб сваёй любві да роднай партыі Леніна—Сталіна, аб сваёй бязмежнай любві і ўдзячнасці да вялікага друга народаў правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Нарада была дэманстрацыяй велізарнага культурнага росту, актыўнасці, свядомасці і палітычнай боездольнасці жанчын Совецкага Саюза. Яна паказала, якія велізарныя пласты падняты Вялікай пролетарскай рэволюцыяй, якая велізарная сіла вырасла за гэтыя 19 год у Совецкім Саюзе. Дэлегаты нарады з трыбуны, з якой таварыш Сталін зрабіў свой яркай сілы даклад аб праекце Канстытуцыі, расказвалі аб сваёй рабоце і прафесіі. На трыбуну падымаліся жанчыны—жонкі камандзіраў, палітработнікаў і начальнікаў Чырвонай Арміі, лётчыкі, парашутысты, танкісты, кулямётчыкі, варашылаўскія стралкі, кавалерысты, фізкультурніцы, работніцы дзіцячых устаноў, мацеры камандзіраў і т. д. Колькі іх выдатных жанчын у нашай краіне!

Многія з іх разам з мужамі прайшлі суровы шлях грамадзянскай вайны, многія на далёкіх граніцах нашай краіны — у сопках, у тайзе Далёкага Ўсходу, у лясах і балотах Беларусі разам з мужамі «асвойвалі» граніцу, перамагалі цяжкасці, цярпелі лішэнні, будавалі, ствараллі ўтульнасць у кватэрах камандзіраў, казармах байцоў, неслі культуру, вучылі грамаце, абсталёўвалі сталовыя, дзіцячыя сады, яслі, а калі трэба, то браліся і за зброю. Усё ў імя сваёй соцыялістычнай радзімы.

Жонка камандзіра гэта — не хатняя гаспадыня, а баявая падруга мужа. Яна так як і муж жыве інтарэсамі Чырвонай Арміі штодзенна, штогадзінна клапоціцца аб умацаванні яе боездольнасці. Жонка камандзіра ў той-жа час і баец Чырвонай Арміі, бо ўладаючы тым ці іншым або адразу цекалькімі відамі зброі, яна заўсёды гатова разам з мужам накіраваць гэту зброю супроць таго, хто пасмее пасягнуць на нашу соцыялістычную краіну, хто пасмее парушыць святую недатыкальнасць яе граніц, яе гонар. І зусім заслужана ЦВК СССР узнагародзіў лепшых з іх вышэйшай узнагародай — ордэнамі Саюза.

Наша краіна па заслузе ганарыцца сваімі лепшымі дачкамі — актывісткамі з жонак каманднага і начальніцкага складу Чырвонай Арміі. Наша краіна ганарыцца сваімі лепшымі дачкамі — гераінямі працы, стаханаўкамі прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі, многія з якіх узнагароджаны вышэйшай узнагародай — ордэнамі Саюза.

Толькі ў нашай краіне, толькі дзякуючы клопатам нашай большэвіцкай партыі і таварыша **Сталіна** прапоўныя жанчыны, раней забітыя, адсталыя, бескультурныя, бяспраўныя, зараз прабуджаны да жыцця, атрымалі роўныя правы з мужчынай і актыўна ўдзельнічаюць у гаспадарчым і дзяржаўным жыцці краіны. Гэта роўнапраўе жанчыны ў СССР закладаўча замацавана ў 122 артыкуле новай Сталінскай Канстытуцыі.

Совецкія жанчыны на Сталінскую Канстытуцыю адказваюць узмацненнем сваёй работы па соцыялістычнаму будаўніцтву і ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны. У сваёй адозве дэлегаты заклікаюць жанчын: «... мацуйце, кожная на сваім участку абарону нашай вялікай радзімы, памнажайце яе магутнасць і багацце, прымайце ўдзел у абароннай рабоце — будзьце перадавікамі спорту, фізкультуры, вучыцеся страляць, вучыцеся несці санітарную службу ў баі, вучыцеся супрацьпаветранай і супрацьхімічнай абароне, рыхтуйцеся разам з мужамі і братамі пераможна абараняць нашу родную зямлю, абараняць да апошняй каплі крыві нашы правы і заваяванні, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі».

Гэты заклік павінен быць падхоплен усімі жанчынамі прамысловасці, чыгункі, соўгасаў, калгасаў, работнікамі навукі, культурнага фронта нашай Беларускай ССР — фарпоста Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў, гарадскія і раённыя камітэты партыі павінны давесці заклік перадавых жанчын нашай краіны да ўсіх жанчын прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі і ўзначаліць іх творчую ініцыятыву, іх парыў да плодатворнай работы на карысць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

ПАХАВАННЕ ПІСЬМЕННІКА-ОРДЭНАНОСЦА Н. А. ОСТРОЎСКАГА

Раніцою 26 снежня працоўныя сталіцы зноў прышлі ў Дом совецкага пісьменніка аддаць апошні доўг пісьменніку-ордэнаносцу Нікалаю Алексеевічу Остроўскаму. Там, дзе напярэдадні стаяла раскрытая труна, сёння пакоіцца урна, прыняўшая прах заўчасна згаслага пісьменніка.

У апошніх змепах ганаровай варты стаяць тав. Стэцкі, сакратары ЦК ВКЛСМ тт. Файнберг і Васільева, сакратар БЦСПС т. Вейнберг, дэлегацыя комсамола Украіны на чале з сакратаром ЦК ЛКСМУ т. Ярэмчук, пісьменнікі Стаўскі, Фадзееў, Кіршон, Кірпоцін, Караваева, Бедны, Берэзоўскі.

У 12 гадзін члены камісіі па пахаванню і бліжэйшыя прыяцелі нябожчыка падымаюць жалобны катафалк, на якім устаноўлена урна з прахам Н. А. Остроўскага і беражна выносяць яго з Дома совецкага пісьменніка. У суправаджэнні ганаровага вайсковага эскорта жалобная працэсія павольна ідзе па вуліцах сталіцы да Новадзевічых могілак. Наперадзе — дзесяткі вянкоў. На чырвонай эксамітнай падушачцы нясуць ордэн Леніна.

У 14 гадзін 15 мінут на Новадзевічых могілках т. Фадзееў адкрывае жалобны мітынг.

Таварышы Файнберг, Кіршон, Дзімітрый Остроўскі і іншыя ўсхвалявана гавораць пра пісьменніка-большэвіка, які аддаў усё сваё кароткае жыццё барацьбе за справу комунізма. Мітынг скончыўся. Урна з прахам Н. А. Остроўскага замуроўваецца ў сцяне.

14 гадзін 40 мінут. Грыміць трохразовы ружэйны салют. Жалобны марш змяняецца гукамі «Інтэрнацыянала». (БЕЛТА).

НАРКОМ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР тав. КРЫЛОЎ.

Пастановай ЦВК БССР тав. Крылоў Нікалай Петровіч назначан народным камісарам харчовай прамысловасці БССР.

Тав. Крылоў нарадзіўся ў 1891 годзе ў вёсцы Зашышэўя, былой Тверской губерні (Калінінская вобласць) у беднай сялянскай сям'і.

5 мая 1917 года тав. Крылоў уступае ў партыю большэвікоў і вядзе падпольную рэволюцыйную работу. Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі выбіраецца членам Петраградскага совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і займае рад адказных пасад на гаспадарчай, профсаюзнай рабоце і ў Чырвонай Арміі.

У 1923 годзе Н. П. Крылоў паступае ў комуністычны універсітэт імя Свердлова, які скончыў у 1926 годзе. Пасля сканчэння універсітэта т. Крылоў — на партыйнай рабоце ў Сібіры. У 1930 годзе быў выбран членам бюро і сакратарыята Сібірскага крайкома ВКП(б). Потым, на працягу 4 год, працуе ў Крыме ў якасці старшыні Совета профсаюзаў. Са жніўня 1935 года працуе ўпаўнаважаным Наркамхарчпрома СССР пры СНК БССР і з'яўляецца членам Совета пры наркоме харчовай прамысловасці СССР.

НАРКОМ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР тав. ГЕАРГАДЗЕ



Пастановай ЦВК БССР тав. Геаргадзе Пімен Паўлавіч назначан народным камісарам лёгкай прамысловасці БССР.

Геаргадзе радзіўся ў 1897 годзе ў вёсцы Окрыба, Кутаіскага раёна (Грузія) у сям'і селяніна-серадняка.

У кастрычніцкіх дні 1917 г. П. П. Геаргадзе паступіў добраахвотна ў Чырвоную гвардыю, прымаў удзел у разгроме юнкераў. З гэтага часу і да 1924 года служыў у Чырвонай Арміі і яе органах, займаючы там рад адказных пастоў.

Пасля дэмабілізацыі тав. Геаргадзе вучыўся ў інстытуце імя Плеханава, які скончыў у 1930 годзе, атрымаўшы званне ваеннага інжынера тэхналогіі.

Пачынаючы з 1932 года, тав. Геаргадзе працуе ў БССР на радзе адказных гаспадарчых пастоў.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА НАРОДНАГА КАМІСАРА АБАРОНЫ МАРШАЛА СОВЕЦКАГА САЮЗА тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЗЕ ЖОНАК КАМАНДНАГА І НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РСЧА

Таварышы, ваша нарада скончана. Што можна сказаць у заключэнне? Можна сказаць толькі адно — нарада жонак каманднага і начальніцкага складу нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі была плодатворнай: была, я сказаў-бы, разумнай і выдатнай.

Яна была такой, якой не можа не быць нарада жанчын нашай краіны, жанчын, якія прадстаўляюць велізарную армію жонак — падруг нашых слаўных камандзіраў і начальнікаў.

Але, як-бы ні была выдатная справа ў нашай краіне, у тым ліку і наша добрая нарада, яна не можа ўсяліць у нас пачуцця заспакоенасці, а тым больш, зазнайства. Вы, таварышы, зрабілі ўжо многа, але вам прадстаіць яшчэ велізарная работа. Трэба яшчэ больш энергічна павесці справу сярод жонак, мацярэй і сяспёр каманднага і начальніцкага складу, каб упягнуць яшчэ большыя пласты нашых жанчын у грамадскае жыццё, далучыць іх да творчай работы.

Наша нарада была-б не карыснай, яна не дала-б таго, што абавязана даць, калі-б мы хоць на момант уявілі, што намі ўжо зроблена ўсё, або амаль усё. Гэта было-б выхвальствам і зазнайствам, а вы, напэўна, ведаеце што гэта не ў духу большэвікоў. Таварыш **Сталін** з'яўляецца самым непрымірымым ворагам выхвальства і зазнайства.

Вы вядзеце вялікую работу. Яна вялікая іменна таму, што ўцягнуты ўжо тысячы і тысячы жанчын у патрэбную, вялікую грамадска-карысную справу. Я не гавару аб тых жанчынах, якія выступалі тут і ў ваеннай форме, і без формы, жанчынах, з якіх адны з'яўляюцца камандзірамі, другія служачымі нароўні з мужчынамі ў РСЧА.

Гэтыя выдатныя жанчыны, побач са сваім спецыяльным службовым абавязкам, нясуць яшчэ і дадатковую, добраахвотную грамадскую нагрузку. Я гавару аб жанчынах, якія іншы раз без усякіх прычын яшчэ не ўзняліся да ўсведамлення неабходнасці актыўна, па-сапраўднаму ўключыцца ў будаўніцтва соцыялізма, стаць у рады нашых грамадскіх работніц, актывістак. Я гавару аб іх, якіх абавязкова трэба ўсіх зрабіць актыўнымі будаўнікамі нашай соцыялістычнай радзімы.

Раз'ехаўшыся адсюль, я пераконан, вы падвоіце, патроіце вашу энергію, праявіце яшчэ больш ініцыятывы, зробіце ўсё, што ад вас залежыць, каб у вашых часцях, гарнізонах, дзе вы працуеце, дзе жывеце, незалежна ад таго у якім геаграфічным пункце Совецкага Саюза яны размешчаны, не было-б ні адной жанчыны, якая не працавала-б разам з вамі, не вучылася-б сама, не вучыла іншых, якая не станавілася-б актыўным будаўніком нашага жыцця.

Ваша абаронная работа, таварышы, дорага, і мы яе высока пэнім таму, што вы аблягчаеце жыццё, дзейнасць, напружаную работу вашых мужоў, бацькоў і братоў.

Чым больш і лепш вы будзеце займацца грамадскай і непасрэдна абаронпай работай, тым лягчэй будзе нашым камандзірам і начальнікам рабіць сваю непасрэдную справу — павышаць баявую падрыхтоўку Чырвонай Арміі, тым лягчэй будзе ім рыхтавацца да таго, каб у патрэбную мінуту выйсці супроць ворага ва ўсеўзбраенні, выставіць супроць яго магутную сілу, не толькі фізічна і тэхнічна добра скалочаную, але таксама і духоўна па-сталінску падрыхтаваную.

Будзем-жа, таварышы, і ў далейшым, як да гэтага часу, упарта працаваць, падвоім, патроім нашу энергію, удесяцярым ініцыятыву. Загартуем сябе яшчэ мацней на перамаганне ўсіх і ўсякіх цяжкасцей.

Даб'емся поўнага ўцягнення ўсіх жонак каманднага і начальніцкага складу ў грамадска-палітычнае жыццё і творчую работу. Няхай наша слаўная радзіма яшчэ больш атрымлівае ад сваіх сыноў і дачок, ад вас — нашых слаўных падруг. Няхай Сталінская Канстытуцыя пацвярджаецца яшчэ большымі справамі, справамі добрымі, культурнымі, усебаковымі, справамі совецкай жанчыны.

Я лічу, таварышы, вашу нараду выдатнай яшчэ і таму, што яна, з'яўляючыся другой пасля нарады жонак гаспадарнікаў-інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці, будзе штурхачом, будзе служыць узорам таго, як трэба арганізаваць жанчыне, якая непасрэдна не занята вытворчасці.

У нашай краіне няма і не можа быць такога становішча, калі-б чалавек—будзь то мужчына ці жанчына — не знайшоў прымянення сваім здольнасцям, сваёй энергіі, сваім талентам. Таму, працуючы ў гарнізонах, трэба дапамагаць не толькі жанчынам — баявым падругам каманднага і начальніцкага складу, але і жанчынам прамысловасці, транспарту, жанчынам, якія працуюць на культурных і іншых франтах.

Віншую вас з паспяховым завяршэннем вашай выдатнай нарады. Жадаю поспеху ў вашай рабоце і выказваю поўную ўпэўненасць, што вы яшчэ больш будзеце працаваць над тым, каб ваш слаўны бліскучы рух шырыўся і паглыбляўся.

Пад кіраўніцтвам нашай пудоўнай, усеперамагаючай комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам нашага мудрага, вялікага **Сталіна** будзем разам, нага ў нагу, мужчыны і жанчыны, усе працоўныя нашай слаўнай, вялікай радзімы крочыць наперад па шляху да комунізма.

Няхай жыве наша вялікая комуністычная партыя!

Няхай жыве наша слаўная радзіма!

Няхай жыве наш друг, настаўнік і правадыр вялікі **Сталін!**

(Доўгая, бурная авацыя, прывітальныя воклічы ў гонар таварыша Сталіна, крыкі «ура»).

Прысутнічаўшыя на вашай нарадзе члены ПК партыі і Урала рашылі ўзбудзіць халайніцтва перад ураламі аб узнагароджанні найбольш заслужаных актывісткаў — жонак каманднага і начальніцкага складу ордэнамі СССР. **(Выбух апладысментаў).**

Дазвольце Ўсесаюзную нараду жонак камандзіраў і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі абвясціць закрытай.

(Усе дэлегаты нарады спяваюць «Інтэрнацыянал». Пад сводамі залы магутна раздаюцца гукі пролетарскага гімна. Дэлегаты нарады вітаюць кіраўнікоў партыі і ўрада, махаюць кветкамі і рознакаляровымі стужкамі).

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ САЮЗА ССР ЖОНАК КАМАНДНАГА І НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РСЧА

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

За энергічную работу сярод жонак каманднага і начальніцкага складу і за актыўны ўдзел у культурна-асветнай рабоце ў часцях Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР пастанаўляе ўзнагародзіць:

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

1. **Хетагураву** (Зарубіну) Валенціну Семёнаўну;
2. **Рудневу** Юлію Канстанцінаўну;
3. **Гайліт** Екацерыну Паўлаўну;
4. **Жданаву** Валенціну Дзенісаўну;
5. **Халасцякову** Праскоўю Іванаўну;
6. **Руданову** Іраіду Паўлаўну;
7. **Зіміну** Екацерыну Нікалаеўну;
8. **Омер-Імерэлі** Валенціну Якаўлеўну;
9. **Назознаву** Елену Цімафееўну;
10. **Лешчынскую** Маргарыту Вячэславаўну;
11. **Гарунову** Александру Семёнаўну;
12. **Сергееву** Тэклу Іванаўну;
13. **Грызадубаву** Валенціну Спепанаўну,
14. **Башэніну** Веру Эмануілаўну;
15. **Чэрнікаву** Вікторыю Ісаеўну;
16. **Турчыну** Марыю Антонаўну;
17. **Осіпенка** Паліну Дзенісаўну;
18. **Кутаву** Любоў Іванаўну;
19. **Несцерэнка** Марыю Петроўну;
20. **Місеяіч** Галіну Іванаўну.

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПОЧЕТА»:

1. **Сюбаеву** Анну Фёдараўну;
2. **Судзьбіну** Любоў Паўлаўну;
3. **Якір** Сару Лазараўну;
4. **Аксенаву** Фаіну Дмітрыеўну;
5. **Балабанаву** Марыю Іванаўну;
6. **Мірончэнка** Ксенію Егораўну;
7. **Бахіліну** Соф'ю Міхайлаўну;
8. **Гіцько** Серафіму Пракоф'еўну;
9. **Звіну** Надзежду Іванаўну;
10. **Хахлову** Галіну Сергееўну;
11. **Ксенафонтаву** Валенціну Гаўрылаўну;
12. **Меншакову** Зінаіду Міхайлаўну;
13. **Гаранч** Бальбіну Норбертаўну;
14. **Мілехіну** Фаіну Петроўну;
15. **Рабчэнка** Ніну Цімафееўну;
16. **Озоліну** Александру Алексееўну;
17. **Манаенка** Еўгенію Васільеўну;
18. **Панкратаву** Екацерыну Міхайлаўну;
19. **Васільеву** Клаўдзію Александраўну;
20. **Савелаву** Марыю Фёдараўну;
21. **Бурсаву** Александру Іванаўну;
22. **Вадалазаву** Еўдакію Фёдараўну;
23. **Крывелеву** Зінаіду Іванаўну;
24. **Бардадзіну** Ашхен Макараўну;
25. **Кавалёву** Праскоўю Якаўлеўну;
26. **Русакову** Пелагею Паўлаўну;
27. **Очэрэтную** Ангеліну Міхайлаўну;
28. **Чурумаву** Антаніну Міхайлаўну;
29. **Ошуркову** Екацерыну Александраўну;
30. **Платонаву** Серафіму Васільеўну;
31. **Рагозную** Еўгенію Сцепанаўну;
32. **Ліксонаву** Сусану Фёдараўну;
33. **Фельд** Паліну Грыгор'еўну;
34. **Ганчарову** Ольгу Міхайлаўну;
35. **Грышэль** Людмілу Антонаўну;
36. **Соргіну** Марыю Іванаўну;
37. **Перліну** Лену Шаеўну;
38. **Чэпель** Елену Міхайлаўну;
39. **Кошэлеву** Праскоўю Іванаўну;
40. **Макараву** Анну Кузьмінічну;
41. **Краснеўскую** Веру Грыгор'еўну;
42. **Кузнецову** Зінаіду Васільеўну;
43. **Опарыну** Марыю Канстанцінаўну;
44. **Цветкову** Марыю Александраўну;
45. **Круглову** Зою Філіпаўну;
46. **Бабаеву** Елізавету Міхайлаўну;
47. **Якаўлеву** Надзежду Фёдараўну;
48. **Долгаву** Антаніну Іванаўну;
49. **Харламаву** Ольгу Петроўну;
50. **Лысенкаву** Веру Іванаўну;
51. **Калашнікаву-Вадзянаву** Марыю Нікалаеўну;
52. **Сільверставу** Марыю Семёнаўну;
53. **Конанаву** Праскоўю Іванаўну;
54. **Вінаградаву** Елізавету Алексееўну;
55. **Тымінскую** Феадосію Петроўну;
56. **Егораву** Елену Алексееўну;
57. **Цхведзіяні** Тамару Іванаўну;
58. **Абдулаеву** Алмаз Калжы-Кізы;
59. **Багдасаран** Сусану Сысакаўну;
60. **Панфілаву** Марыю Іванаўну;
61. **Рахімаву** Гаўхар Арпёмаўну;
62. **Каліта** Малік Хусаінаўну;
63. **Калугіну** Александру Ігнацьеўну;
64. **Мелюшчэву** Хрысціну Александраўну;
65. **Дзеркач** Александру Алексееўну;
66. **Харчэўнікаву** Мацільду Нікалаеўну;
67. **Сабяніну** Любоў Іванаўну;
68. **Супрыновіч** Екацерыну Іосіфаўну;
69. **Уткіну** Елізавету Міхайлаўну;
70. **Палянінаву** Зінаіду Васільеўну;
71. **Сысойкіну** Надзежду Міхайлаўну;
72. **Курыленка** Елену Арпём'еўну;
73. **Лаўрэнцьеву** Анну Іванаўну.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.
25 снежня 1936 г.

ВАЕННА-ФАШЫСЦКІ МЯЦЕЖ У ІСПАНІІ

Паведамленне камітэта абароны Мадрыда

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 25 снежня. (БЕЛТА). У сённяшнім паведамленні камітэта абароны Мадрыда, апублікаваным у поўдзень, гаворыцца:

«На паўночны захад ад Баадылы дэль Монтэ ўрадавыя войскі зноў прасунуліся на 6 кілометраў у напрамку на Брунетэ, не сустрэўшы сур'ёзнага супраціўлення. На занятай урадавымі войскамі тэрыторыі знойдзена шмат трупаў мараканскіх салдат і салдат грамадзянскай гвардыі.

Мадрыд зноў падвергся бамбардыроўцы з самалётаў мяцежнікаў. Шмат бомб упала ў рабочае прадмесце Вальэкас; бомбы скінуты таксама ля музея Прадо. Налічваецца шмат афяр».

Становішча на франтах

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 25 снежня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Фабра, урадавыя войскі на мадрыдскім фронце пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі працягвалі наступленне ў раёне Баадылья дэль Монтэ (на захад ад Мадрыда), амаль не сустракаючы супраціўлення з боку мяцежнікаў. Урадавыя войскі паспяхова дзейнічалі таксама ў раёне Вільявэрдэ (на поўдзень ад Мадрыда). На іншых участках мадрыдскага фронта — зацішша. Агульнае становішча спрыяе ўрадавым войскам.

Эскадрылля ўрадавых самалётаў паспяхова бамбардыравала вакзал і казармы ў Кардове (на поўдні Іспаніі). 4 ўрадавыя бамбардыроўшчыкі і 3 знішчальнікі бамбардыравалі вакзал і ваенныя пабудовы ў Тэруэле (арагонскі фронт). Урадавыя самалёты былі атакованы 6 знішчальнікамі мяцежнікаў. Пасля паветранага бою ўрадавыя самалёты ўдала вярнуліся ў сваё базы.

Сутычкі паміж германскімі часцямі і мяцежнікамі

ПАРЫЖ, 25 снежня. (Улясн. кар. «Правды»). Паведамленні з Мадрыда падкрэсліваюць значэнне атрыманай рэспубліканцамі перамогі ў сектары Баадылья (на захад ад Мадрыда). Прасоўванне рэспубліканцаў было настолькі імклівым, што ў камандавання з'явілася падазронасць, ці не рыхтуе праціўнік лавушку. Было аднак устаноўлена, што мяцежнікі адступілі на 5 кілометраў у глыбіню не па сваёй добрай волі, а з прычыны ўзніклай сярод іх міжусобіцы. Знаходжанне трупаў і кінутых ваенных матэрыялаў не пакідае месца сумненню, што сталяўшыя на гэтым участку войскі мяцежнікаў падверглісся абстрэлу з двух бакоў: з боку наступаўшых рэспубліканцаў і з боку «сваіх».

Калі перадавыя часці мяцежнікаў пачалі адступаць пад націскам рэспубліканцаў, то яны натыкнуліся на заслон, які адкрыў па іх агонь. Ёсць падставы меркаваць, што гэты заслон складаўся з германскіх часцей. Паміж іспанскімі і германскімі часцямі ў лагеры мяцежнікаў ужо да гэтага было некалькі сутычак.

Н. МАЙОРСКІ.



Кавалерысты ўрадавых войск вяртаюцца пасля ўдалай разведкі на мадрыдскім фронце.

„Рождественский" паветраны налёт на Мадрыд

МАДРЫД, 25 снежня. (Улясн. кар. «Правды»). Калядная ноч на лініях абароны Мадрыда прайшла спакойна, але не піха. Фашысцкая авіяцыя ноччу бамбардыравала Мадрыд. Некалькі бомб упала ў цэнтр горада — забіта 12 чалавек. У гэты час самалёты рэспубліканцаў бамбардыравалі палявыя пазіцыі мяцежнікаў.

Перад вячэрай з фашысцкіх акопаў было чутно спяванне. Урачысты малебен аб здароўі генерала Франко ім давялося слухаць не ў мадрыдскіх саборах, як гэта было намечана, а на свежым паветры. Дружыннікі адказвалі на малебен рэвалюцыйнымі песнямі. На некалькіх участках камісары праз рупар выступалі з прамовамі да салдатаў, якія знаходзіліся ў варожых акопах. Іх слухалі не перабіваючы.

На калядную вячэру на рэспубліканскія лініі прышло некалькі дзесяткаў перабежчыкаў. Той-жа ночу група партызан у глыбокім тыле праціўніка перайшла раку Тахо, недалёка ад Талаверы, знішчыла поезд з 23 вагонаў з баявым снаражэннем і зруйнавала чыгуначны шлях.

Міх. КАЛЬЦОЎ.

***

ПАРЫЖ, 26 снежня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас з Мадрыда, учора артылерыя мяцежнікаў узмоцнена бамбардыравала цэнтр сталіцы — вуліцы, якія акружаюць будынак тэлефоннай станцыі. Буліцы былі перапоўнены народам. Лік афяр не ўстаноўлен. Як толькі пачалася бамбардыроўка, людзі хлынулі да бліжэйшай станцыі метро. Дружыннікі міліцыі хутка прынялі меры да забеспячэння паралку. Бамбардыроўка пягнулася гадзіну. Пяжкім снарадам быў прабіт фасад тэлефоннай станцыі. Два іншыя снарады выклікалі ў будынку пязначны пажар, які быў хутка ліквідаваны пажарнымі.

Англа-германскія перагаворы

ЛОНДАН, 23 снежня. (БЕЛТА). Згодна вестак агенцтва Рэйтэр, некалькі дзён назад, да ад'езду германскага пасла Рыбентропа ў Берлін, міністр замежных спраў Ідэн у гутарцы з ім указаў, што Англія з усёй сур'ёзнасцю адносіцца да пасылкі «добраахвотнікаў» з Германіі на дапамогу іспанскім мяцежнікам. Падолле слоў агенцтва, Рыбентроп асабіста паведаміць аб гэтым пункце гледжання англійскага ўрада Гітлеру.

Як думаюць, піша агенцтва, Ідэн абмяркоўваў з Рыбентропам пытанне аб падрыхтоўцы канферэнцыі лакарнскіх краін (дзяржаў, падпісаўшых Лакарнскі дагавор).

Агенцтва паведамляе таксама, што ў гутарках Ідэна з Рыбентропам было закранута пытанне аб адносінах франка-савецкага дагавору да намечанага новага лакарнскага пагаднення. Указвалася, што і франка-савецкі дагавор, і новае лакарнская пагадненне павінны прадугледжваць адну і тую працэдуру для азначэння агрэсара, у праціўным выпадку Францыя можа аказацца перад неабходнасцю выконваць абавязацельствы, якія супярэчаць адно другому.

Згодна франка-савецкага дагавору, Францыя можа пры некаторых акалічнасцях прысці на дапамогу Савецкаму Саюзу, не чакаючы рашэння Совета Лігі нацый, і супроць гэтага асабліва пярэчыць Германіі. Як указвае агенцтва Рэйтэр, англійскі ўрад у перагаворах аб падрыхтоўцы канферэнцыі лакарнскіх краін настойваў на тым, што абавязацельствы, прадугледжаныя 16 арт. статута Лігі нацый, павінны выконвацца незалежна ад усіх іншых абавязацельстваў аб ненападзе, як гэта было прадугледжана раней шым Лакарнскім дагаворам 1925 года.

ВЫКАНАН ГАДАВЫ ПЛАН ПА СТАЛІ І ПРАКАТУ

ЦК ВКП(б)—таварышу СТАЛІНУ І. В. СНК СССР—тав. МОЛАТАВУ В. М. Народнаму камісару цяжкай прамысловасці—таварышу С. ОРДЖАНІКІДЗЕ

25 снежня заводамі Наркамцяжпрома датэрмінова выканан гадавы план па сталі і пракату.

Сталі выплаўлена 15.905 тыс. тон пры плане 15.860 тыс. тон.

Пракату выпушчана 12.115 тыс. тон пры плане 12.100 тыс. тон.

Да канца года будзе дано звыш плана 340 тыс. тон. сталі і 260 тыс. тон пракату.

Прырост супроць 1935 года па сталі—30,4 проц. або 3.780 тыс. тон, і па пракату — 32 проц. або 3 мільёны тон.

Наркамцяжпром — ГУРЗВІЧ.
Галоўнае кіраўніцтва металургічнай прамысловасці — КАНЕР, ТАЧЫНСКІ.

ВЫДАТНЫ ПАХОД ПАДВОДНАЙ ЛОДКІ

ВЛАДЗІВАСТОК, 25 снежня. (БЕЛТА). Закончыўся легендарны аўтаномны паход падводнай лодкі, якой камандуе тав. Клевэнскі. Лодка тав. Клевенскага пабіла ўсе існуючыя рэкорды аўтаномнага плавання. Многія дні знаходзілася яна ў моры пад жорсткімі ўдарамі зімніх тайфунаў і прайшла сотні міль, праразаючы глыбіні мораў, якія амываюць совецкі Далёкі Ўсход.

Усе людзі ў апошні дзень паходу працавалі таксама роўна і чотка, як і ў пачатку паходу. Механізмы лодкі ў поўным парадку.

Адважных падводнікаў сустракалі намеснік камандуючага Ціхаакіянскім флотам флагман 1-га ранга тав. Кірэеў, намеснік камандуючага флотам па палітычнай частцы армейскі камісар 2-га ранга тав. Окунеў, сакратар Прыморскага абкома партыі тав. Мякінен, камандзіры і чырвонафлотцы іншых падводных лодак, а таксама сем'і камандзіраў — удзельнікаў паходу. Тут-жа адбыўся мітынг.

ЗНОЙДЗЕНЫ ЗАБОЙЦЫ М. В. ПРОНІНАЙ

КУЙБЫШЭЎ, 25 снежня. (БЕЛТА). Следчымі органамі раскрыта забойства ўвечары 11 снежня дэлегаткі Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў настаўніцы М. В. Пронінай. Устаноўлена, што гэта забойства зроблена Александрам Розавым, Віктарам Федотавым і Дзмітрыем Ешчэркіным.

Адзін са злачынцаў Розаў нанёс тав. Пронінай 9 нажовых ран. Затым, пакінуўшы яе ўжо мёртвай пад акном дома № 17, па Больнічнай вуліцы, злачынцы схаваліся на могілках, а адтуль у доме Розава па Садовай вуліцы.

На другі дзень пасля забойства Розаў і Федотаў, баючыся ўлік, спалілі чамадан тав. Пронінай, спачатку адарваўшы ад яго металічныя часткі, і закапалі гэтыя часткі пад насціпам дваровага ганка, дзе яны і былі знойдзены пры вобыску. З таго, што было ў чамадане — дзве дзіцячыя шапачкі, якія Пронінa везла ў падарунак сваім дзецям, некалькі метраў мануфактуры, плацці Пронінай, грамафонныя пласцінкі і інш. — злачынцы частку рачаў схавалі ў падвале дома, дзе яны былі ўзяты пры вобыску, а частку схавалі ў сястры і ў сваячкі Розава. Усе гэтыя рэчы, а таксама металічныя часткі чамадана былі апазнаны Александравай і іншымі сведкамі. Усе злачынцы поўнасцю сазналіся і расказалі ўсе падрабязнасці зробленага імі злачынства.

Прыцягнуты таксама да крымінальнай адказнасці былы старшыня раённага выканаўчага камітэта Коннаў і яго былы намеснік — загадчык райза Шышкін.

Следства па справе ў бліжэйшы час будзе закончана, і справа будзе перадана ў суд.

ДА ЎСІХ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ, КАЛГАСАЎ, КАМСОДАЎ, ФІНСЕКЦЫЙ, УПАЎНАВАЖАНЫХ СЕЛЬСОВЕТАЎ ПА ПАЗЫЦЫ, ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ, КАЛГАСНІЦ І ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ

Дарагія таварышы!

Лепшыя выбраннікі народу на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў зацвердзілі Сталінскую Канстытуцыю.

Наша радзіма ўжо жыве зараз па новаму сталінскаму закону. Гэта — закон шчаслівага творчага соцыялістычнага жыцця.

Калгаснікі перадавых калгасаў у адказ на сусветна-гістарычны даклад таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў і зацвярджэнне Канстытуцыі поўнасцю і датэрмінова ўнеслі свае грашовыя ўзносы па сваёй падпісцы на пазыку «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) і заклікалі калгаснікаў і калгасніц да поўнага і датэрміновага пакрыцця ўзносаў сваёй падпіскі на пазыку, каб тым самым умацаваць фінансавую магутнасць краіны Советаў.

Гэты каштоўны пачын павінен быць падхоплен усімі калгаснікамі і калгасніцамі нашай ордэнаноснай БССР.

У гэтым павінны адыгрываць вялікую ролю советы, масавыя органы советаў — фінсекцыі, дэпутацкія групы, камсоды, фінактывісты і ўпаўнаважаныя сельсоветаў па пазыцы.

Советы, фінсекцыі, камсоды, упаўнаважаныя сельсоветаў па пазыцы, арганізуйце суцэльную праверку ходу збору пазыковых узносаў у сельсоветах, растлумачце калгаснікам, калгасніцам і працоўным адназасобнікам значэнне своечасовага ўнясення грашовых узносаў па падпісцы на пазыку!

На шырокіх пленумах сельсоветаў, на сходах калгаснікаў і калгасніц абмяркуйце вынікі работы ўпаўнаважаных сельсоветаў па збору пазыковых узносаў з калгаснікаў, узяўшы іх работу пад грамадскі кантроль і падвергнуўшы большэвіцкай крытыцы работу тых упаўнаважаных, хто нядобрасумленна выконвае свае абавязкі.

Калгаснікі і калгасніцы! Выконвайце сумленна свой абавязак перад дзяржавай, падхапіце пачын парадавых калгаснікаў і неадкладна ліквідуйце сваю запазычанасць па ўзносах на пазыку «Другая пяцігодка» (выпуск чацвертага года).

Пад спягам Сталінскай Канстытуцыі працоўныя Совецкай Беларусі, неаддлучнай часткі Совецкага Саюза, выканаюць свой абавязак перад партыяй і ўрадам і забяспечаць ордэнаноснай Беларусі перадавое месца па выкананню фінансавага плана года вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР і БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

23 снежня 1936 г., г. Менск.

ЗАВОД РЫХТУЕЦЦА ДА 1937 ГОДА

Яшчэ некалькі дзён, і пачнецца новы гаспадарчы год. Кожнае прадпрыемства нашай краіны падводзіць вынікі сваёй работы, намячае новы план. Наш варштатабудаўнічы завод імя Варашылава новы год сустракае перамогай. Промфінплан 1936 года выканан да 1 снежня на 100,9 проц. Мы далі прадукцыі на 7.162 тыс. рублёў.

У 1937 годзе перад нашым заводам устаюць вялікія перспектывы росту. Прыязнем асноўныя намёткі нашага плана. План таварнага выпуску прадукцыі павялічваецца ў параўнанні з фактычным выпускам гэтага года на 1.900 тыс. руб., гэта значыць на 27 проц. Аб'ём вытворчасці ўзрастае на 12 проц. Завод дасць краіне на 8.900 тыс. рублёў прадукцыі.

Змяняецца і асартымент выпускаемай намі прадукцыі. У гэтым годзе мы выпусцілі першы вопытны радыяльна-свідравальны варштат. У 1937 годзе завод выпусціць іх у серыйным парадку. Прыступаем да асваення і выпуску аднакалонных прадольна- стругальных варштатаў і свідравальных варштатаў новай канструкцыі нашага завода. Перад намі стаіць задача аднаўлення выпуску прэсаў для прэсавання кармоў, а таксама ўдасканалення і паляпшэння выпускаемай прадукцыі (свідравальныя варштаты, камнедрабілкі і інш.).

Як мы рыхтуемся да асваення новых відаў прадукцыі? Па радыяльна-свідравальных варштатах наш завод кааперыруецца з маскоўскім заводам «Станкоконструкция», якому пасланы ўжо дэталі па 10 камплектаў для іх апрацоўкі. 1 студзеня мы атрымліваем апрацаваныя там камплекты і прыступаем да іх выравбу. Заканчваем падрыхтоўчую работу па выпуску аднакалонных стругальных варштатаў з разлікам, каб да 1 мая даць першы вопытны варштат.

У 1937 годзе план выпуску шырспажыву па нашаму заводу складае 300 тыс. рублёў супроць плана 1936 года ў 140 тыс. рублёў. Завод павінен будзе асвоіць новыя віды прадукцыі шырспажыву — дзіцячыя веласіпеды, саможную фарніТуру.

Такія лічбы, якія паказваюць рост нашай праграмы. Варта адзначыць, што галоўны ўпор у новым годзе будзе на павелічэнне якасці прадукцыі і змяншэнне сабекошту. Але, як вядома, выкананне ўсякай праграмы залежыць ад жывых людзей. У апошнія гады ў асобных месяцах не выконваўся промфінплан з прычыны адсутнасці кваліфікаваных кадраў некаторых прафесій, у прыватнасці слесараў, такароў, фрэзероўшчыкаў, стругальшчыкаў. Гэта нас таму-сяму навучыла. Мы набралі 98 чал., з якіх завод рыхтуе рабочых дэфіцытных прафесій. Школа стаханаўцаў у 1937 годзе дасць нам 5 майстроў і 35 кваліфікаваных рабочых.

Калектыў рабочых нашага завода, як і заўсёды, гатоў па-стаханаўску біцца за выкананне намечанай праграмы, за новыя перамогі.

М. К. ЛІСОЎСКІ,
Дырэктар менскага варштатабудаўнічага завода імя Варашылава.

ШКАДУЮ, ШТО РАНЕЙ НЕ ЎСТУПІЎ У КАЛГАС

ПОЛАЦК. У сувязі з вывучэннем новай Канстытуцыі і даклада таварыша Сталіна ў Ветрынскім раёне пачаўся масавы прыліў аднаасобнікаў у калгасы. За апошнія два—тры дні ў калгасы ўступіла 21 аднаасобная гаспадарка.

Асабліва вялікі прыліў наглядаецца ў Гарадоцкім, Гомельскім і Варонецкім сельсоветах.

На агульным сходзе ў калгасе «Окцябр» у часе вывучэння Сталінскай Канстытуцыі аднаасобніца Юшкевіч Хрысціна папрасіла слова:

— Дарагія калгаснікі, не магу падабраць такіх слоў, каб з усёй паўнатой выказаць усё тое, што я перажыла за апошні час, — кажа Юшкевіч Хрысціна. — Паверце, мае бацькі так не клапаціліся аб сваіх родных дзецях, як па-бацькоўску клапоціцца наш вялікі і мудры правадыр таварыш Сталін аб нас, працоўных сялянах. Я ад усёй душы завідую вам, вашаму шчаслівому заможнаму жыццю. А да ўступлення-ж у калгас вы жылі не лепш, чым жыву я цяпер. Я хачу таксама ўступіць у калгас, хачу разам з вамі чэсна і аддана працаваць, разам з вамі будаваць новае жыццё. Я клянуся, што з гонарам буду насіць імя калгасніцы.

— Я ўбачыў вялікую сілу нашых калгасаў, заможнасць калгаснікаў, — кажа аднаасобнік Пешкін Мартын. — Вы сталі перадавымі, пісьменнымі людзьмі. Я вельмі шкадую, што даўно не ўступіў у калгас і я жыў-бы такім-жа жыццём, як жывеце вы зараз. Я таксама хачу быць калгаснікам.

Агульны сход калгаснікаў вынес аднадушнае рашэнне: задаволіць просьбу аднаасобнікаў — прыняць іх у калгас.

Б. МЕЖАРЫЦКІ.

НОВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

ОРША. Вывучэнне даклада таварыша Сталіна і Сталінскай Канстытуцыі арганізавана ва ўсіх калгасах і брыгадах раёна. У калгасе «Прамень соцыялізма», Крапівенскага сельсовета арганізаваны 4 гурткі.

У гэтым калгасе калгаснікі абавязаліся змагацца за ўраджай 15 цэнтнераў зернавых з гектара. У калгасе закончылі рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Прыступлена да вывазкі ўтнаення, пры чым кожны двор абавязаўся даць па 4 цэнтнеры попелу.

Вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі разгорнута і сярод аднаасобнікаў раёна. 25 аднаасобнікаў у часе заняткаў падалі заявы аб уступленні ў калгас. У Крапівенскім сельсовеце ўступіла ў калгас 9 аднаасобных гаспадарак, Празяцінскім—12, Межанскім — 4. У Пішчалаўскім сельсовеце ў калгас уступіў аднаасобнік тав. Жукоўскі.

РОБЕРМАН.

РАСЦЯГВАЮЦЬ КАРМЫ

Не берагуць кармоў у Крупскім раёне. Не клапаціліся тут аб кармах летам, не клапоцяцца аб іх і цяпер. У калгасе імя Будзённага, Ухвальскага сельсавета засталіся нескошанымі 4 гектары. Апрача таго калгас прадаў аднаасобнікам 6 гектараў сенажаці. Кармы ў калгасе раскрадаюцца і ніхто аб гэтым не турбуецца.

Ёсць многа фактаў, якія сведчаць аб дрэнным захоўванні кармоў у раёне. Вось для прыкладу калгасы «Колас», «Молат» і інш., Шынкароўскага сельсовета. Грубыя кармы ляжаць пад адкрытым небам, гніюць пад дажджом і снегам. У калгасах «Іскра», імя Будзённага, імя Куйбышэва, «Пролетарская перамога», Ухвальскага сельсовета, салома параскідана па гумне. Яе бяруць без усякага ўліку, раскрадаюць каму толькі хочацца.

Факты раскрадання кармоў маюць месца і ў калгасе «Чырвоны востраў», Ігрушацкага сельсовета. Тут ні адна пуня, дзе ляжаць калгасныя кармы, дагэтуль не ахоўвалася. Дзверы ў пунях не зачынялися. Хто ішоў, той браў сена, салому. Нядаўна ноччу прыехала фурманка і накласаў і слова, хоць аб гэтым ведаў калгасны сакавартаўнік. У выніку гэтага ў калгасе не хапае 664 цэнтнеры сена. Калгас «Прэч саху», не ўбраўшы другога ўкосу, адчувае недахоп звыш 1400 цэнтнераў сена. Раскрадаюцца кармы ў калгасах «Чырвоны барацьбіт», Жаберыцкага сельсовета, «Светлая зара», Абчугскага сельсовета, «Молат», Ігрушацкага сельсовета.

За кармы ў асобных калгасах ніхто не нясе адказнасці. Яшчэ не ўсюды ўвесь кармавы баланс перадан загадчыкам фермы. Расходванне кармоў нерацыянальнае. Як правіла, у кароўніках, канюшнях, цялятніках няма кармушак, корм топчацца пад нагамі жывёлы.

Раённы зямельны аддзел не даў ніякіх указанняў калгасам аб захаванні і правільным скарыстанні кармоў.

А. ЛЯСНЫ.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

* Фінансавая камісія французскай палаты дэпутатаў адобрыла праект урадавай гарантыі выпускаемай ва Францыі пазыкі на карысць Польшчы ў суме 1.350 млн. франкаў, З гэтай сумы 1.250 млн. франкаў павінны быць скарыстаны на заказы французскай прамысловасці.

* Швейцарскі ўрад прызнаў італьянскі суверэнітэт над Абісініяй. Ва ўрадавых колах тлумачаць гэта прызнанне імкненнем палепшыць адносіны з Італіяй і прыняць у будучым удзел у эксплаатацыі багаццяў Абісініі.

* Іспанскі ўрад прапанаваў германскаму трансатлантычнаму банку «Банко алеман трансатлантыко» спыніць свае аперацыі ў Іспаніі; адначасова ўкладчыкам банка дазволена атрымаць назад свае збяраженні.

* У Лондане створан усеанглійскі аб'яднаны камітэт дапамогі іспанскаму народу. У камітэт уваходзяць усе арганізацыі, якія імкнуцца дапамагчы рэспубліканскай Іспаніі.

У першую чаргу камітэт рашыў заняцца пытаннем аб эвакуацыі грамадзянскага насельніцтва з Мадрыда.

* У Югаслаўскую гавань Сусак прыбыла дэлегацыя міністэрства замежнага гандлю іспанскага рэспубліканскага ўрада з мэтай наладзіць тавараабмен паміж Іспаніяй і Югаславіяй, а таксама з іншымі балканскімі краінамі. Адначасова ў Сусак прыбылі два параходы з Іспаніі з грузам у 1.200 тон апельсінаў.

* З Гаваны (сталіца вострава Кубы — калоніі ЗША) паведамляюць, што сенат Кубы пастанавіў зволіць з пасады прэзідэнта дзяржавы Гомеса, які абвінавачваецца ў спробах «навязаць прымусам сваю волю парламенту». Прэемнікам Гомеса назначан віце-прэзідэнт Бру.

* Жэнеўскі кантанальны ўрад (урад Жэнеўскага кантона — Швейцарыя) паведаміў усіх служачых і рабочых дзяржаўных прадпрыемстваў, што члены компартыі ці арганізацый, якія прымыкаюць да компартыі, звальняюцца са службы.

* У Лісабон (Партугалія) прыбылі 10 буйных трохматорных ваенных самалётаў германскай вытворчасці. Прыбыццё гэтай партыі самалётаў, як паведамляе англійскі друк, з'яўляецца першым крокам у ажыццяўленні праграмы ўзбраенняў Партугаліі.

СКАРЫСТАЦЬ ВЕЛІЗАРНЫЯ РЭЗЕРВЫ НА ТРАНСПАРЦЕ

Прастоі вагонаў пад грузавымі аперацыямі — сур'ёзнейшы недахоп работы чыгунак, размешчаных на тэрыторыі БССР. Дзесяткі тысяч лішніх гадзін прастойвае рухомы склад, зніжаючы зварот вагонаў.

За 11 месяцаў па віне 20 кліентаў станцыя Гомель мела 24.448 вагона-гадзін прастою. Найбольш наспраўныя кліенты — вагонарамонтны завод імя Ланцуцкага, які здавалася-б, павінен быў паказваць узоры беражлівых адносін да скарыстання вагонаў. Бабруйскі лесакамбінат у гэтым годзе пратрымаў 16.627 вагонаў, заплаціўшы за гэта вялікі штраф. Вагоны, якія павінны былі быць у руху, прастойваюць, ствараючы ў радзе месц затрудненні з дзяржаўнымі перавозкамі.

Рад кліентаў лічаць зусім нармальным штомесячную выплату штрафа за перапрастоі вагонаў, — нават плануюць штрафы. З гэтым злом неабходна раз назаўсёды пакончыць. Па сутнасці, дзяржава тут церпіць страты ў двухкратным размеры: з аднаго боку, лішнія прастоі вагонаў, а з другога — транжыраванне дзяржаўных сродкаў.

Віна за вялікія прастоі ў значнай меры ўскладаецца і на чыгунку. Справа ў тым, што чыгунка да гэтага часу не выконвае ўстаноўленага палажэння аб папярэднім паведамленні кліента за дзве гадзіны да падачы вагонаў пад пагрузку і выгрузку. Гэта неабходна для таго, каб кліент мог правесці неабходныя работы да бесперабойнай і хуткай пагрузкі ці выгрузкі: падрыхтаваць пляцоўку, рабочую сілу, прывесці ў парадак механізмы. Але агенты чыгункі не лічаць для сябе абавязковым папярэджваць кліентаў загадзя, прычым нават калі і робяць гэта, дык у парадку асабістай паслугі, якая, дарэчы, вельмі часта бывае недакладнай: замест падачы вагонаў праз 2 гадзіны пасля папярэджання, падаюць праз 20. Зусім зразумела, што гэта дэзарганізуе работу, прыводзіць да вялікіх звышчасовых аплат грузчыкам.

Бываюць і другога роду выпадкі, калі чыгунка падае вагоны, зусім не лічачыся з выгадамі для правядзення пагрузачна-разгрузачных работ. Вось некалькі фактаў. 21 лістапада на ст. Асіповічы падалі вагон для пагрузкі клёпкі на адлегласці 31 метра ад месца, дзе ляжаў груз, у той час, калі была поўная магчымасць падаць яго бліжэй. Зусім відавочна, што вагон быў затрыман пад пагрузкай больш, чым належала. Такія-ж факты ёсць і на іншых станцыях. Гомельская станцыя, напрыклад, як правіла, не падганяе вагоны для Нафтабазы пад зліўныя трубы. Вагоны для завода імя Ланцуцкага таксама не ставяцца ў спецыялізаваныя месцы пагрузкі. Яны ставяцца не там, дзе зручней і хутчэй можна іх разгрузіць ці пагрузіць, а дзе захочацца агентам чыгункі.

Да прастояў на чыгунках БССР прызвычаіліся. Яны не выклікаюць абурэння. Тут нават створана тэорыя, быццам-бы прастоі нельга ліквідаваць, быццам яны—законная з'ява. Гэта прадзельніцкая тэорыя нават на буйных станцыях не сустракае адпору. А час ужо партыйным арганізацыям пакончыць з ёй, выкрыць яе апартуністычны характар.

Зусім ненармальным з'яўляецца тое, што кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў не цікавяцца станам грузавых аперацый, перадаверыўшы гэту адказную работу сваім агентам. Іменна з гэтай прычыны новабеліцкі тлумачакамбінат, напрыклад, да гэтага часу не мае зліўных прыстасаванняў, а спіртзавод вядзе грузавыя аперацыі ўручную ў той час, калі транспарцёр бяздзейнічае.

Грузчык — рашаючая сіла, ад якой у значнай меры залежыць змяншэнне прастою вагонаў. Між тым, з грузчыкамі мала працуюць. На ст. Мілое, Асіповіцкага аддзялення начальнік грузавой часці разам з прадстаўніком дарогі пераглядзелі аплату грузчыкаў, самавольна знізіўшы яе ў некалькі разоў.

Вялікія прастоі вагонаў па віне чыгункі адбываюцца пасля сканчэння пагрузкі. Кліент закончыў пагрузку і паведамляе гэтым па тэлефону кіраўніцтву станцыі. Але станцыя не спяшаецца. Яна ўсё роўна запіша прастой на кліента. Кліент хвалюецца, напамінае, але вагоны ўсё прастойваюць. Такіх прыкладаў назавычай мала. Іх можна знайсці на кожнай станцыі.

Ёсць факты і простага ашуканства з боку агентаў чыгункі. Начальнік станцыі Магілеў Буры і яго намеснік Стражаў для таго, каб паказаць работу станцыі ў ружовых фарбах, свядома змяншалі сапраўдныя лічбы прастою вагонаў — паказвалі гружаныя вагоны, як пералічаныя ў запас НКШЗ, або пастаўленыя на рамонт. На справе-ж яны ні ў запасе, ні ў рамонце не былі, яны прыходзілі і адыходзілі з паздамі звычайным парадкам, але тысячы вагона-гадзін прастою былі з-за гэтага ўтоены.

13 лістапада вагаўшчык станцыі Гомель Шыдлоўскі проста прыпісаў лішнія вагоны, як загружаныя. Такія-ж факты мелі месца і на станцыі Нова-Беліца, ст. Лагічы і інш. Дыспетчэр ст. Гомель Седляр у парадку ўзаемнай амністыі не адзначыў прастою вагонаў па віне вагоннікаў.

Нельга не адзначыць і таго, што мясцовыя совецкія арганізацыі не цікавяцца пытаннямі барацьбы з прастоямі вагонаў. Праўда, гомельскі і новабеліцкі горсоветы вынеслі пастановы па гэтаму пытанню, але не праверылі іх выканання. У рэзультаце пастановы засталіся пустой дэкларацыяй.

Барацьба з прастоямі вагонаў — сур'ёзнейшае пытанне. Толькі большэвіцкай работай чыгункі і кліентуры будуць дасягнуты станоўчыя вынікі ў гэтай барацьбе. Задача заключаецца ў тым, каб даць нашай краіне дадатковыя тысячы і дзесяткі тысяч вагонаў, якія амортызуюцца, прастойваючы лішнія тысячы гадзін пад пагрузкай і выгрузкай.

ПЯТРОЎ.
Пракурор Беларускай чыгункі.

ДАСКАНАЛАЯ ПАДРЫХТОУКА ПЕРАПІСНЫХ КАДРАЎ РАШАЕ ПОСПЕХ УСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

ПЫТАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ Ў ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

У галіне развіцця нацыянальных па форме, соцыялістычных па зместу культур поспехі нашай краіны, адзінай краіны ў свеце, сапраўды вырашыўшай нацыянальнае пытанне, выключна вялікія.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка знайшла бліскучаэ выражэнне ў Канстытуцыі СССР. Артыкул 123 Канстытуцыі гаворыць:

«Роўнапраўе грамадзян СССР, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця з'яўляецца непарушным законам.

Якое-б то ні было прамое або ўскоснае абмежаванне правоў або, наадварот, устанаўленне прамых або ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці, таксама як усякая пропаведзь расавай або нацыянальнай выключнасці, або нянавісці і пагарды — караюцца законам».

Да моманту стварэння СССР — да пачатку 1923 года — у складзе Саюза ССР было 4 саюзных рэспублікі; апрача таго было 10 аўтаномных рэспублік і 16 аўтаномных абласцей. Па Сталінскай Канстытуцыі СССР складаецца з 11 саюзных рэспублікі і ўключае ў сябе 22 аўтаномных рэспублікі і 9 аўтаномных абласцей.

Народнасці, якія знаходзіліся ў царскай Расіі пад двайным гнётам — нацыянальным і класавым, даведзеныя да грані поўнага вымірання, зараз развіваюцца эканамічна і паспяхова будуюць сваю культуру. Нацыянальныя ўскраіны былі аб'ектам самай зверскай, страшэннай эксплаатацыі. За гады совецкай улады ў нацыянальных рэспубліках і абласцях створана магутная соцыялістычная прамысловасць. Сельская гаспадарка амаль поўнасцю калектывізавана.

Нацыянальныя ўскраіны не мелі раней свайго пролетарыята, а тым больш пролетарыята нацыянальнага. За гады совецкай улады выраслі пролетарскія кадры з карэннага насельніцтва нацыянальных рэспублік. Яшчэ ў 1934 годзе ў Арменіі сярод усіх работнікаў прамысловасці армяне складалі 89 проц., беларусы ў БССР — 63,5 проц., грузіны ў Грузіі — 51,2 проц., немцы ў АССР Немцаў Паволжа — 55,6 проц. і т. д.

Уздым культурнага ўзроўню раней адсталых народаў СССР забяспечваецца пастаноўкай выкладання ў школах і ВНУ на роднай мове. У СССР газеты, кнігі і падручнікі выдаюцца больш чым на 105 мовах.

Справай гонару статыстыкаў Совецкага Саюза з'яўляецца дакладнае запаўненне пункта аб нацыянальнасці.

Буржуазія, праводзячы перапісы, імкнецца выкарыстаць яе даныя ў сваіх класавых мэтах і ўтоіць або сказіць лічбы, якія характарызуюць унутраныя супярэчнасці капіталізма. Для таго, напрыклад, каб паказаць, што Заходняя Украіна з'яўляецца, быццам, па насельніцтву польскай вобласцю — фашысцкая Польшча, праводзячы перапіс, ухітрылася залічыць велізарную колькасць украінцаў у палякі. У рэзультаце гэтага, калі да вайны ў Заходняй Украіне было ўлічана 6,8 мільёнаў украінцаў і адзін мільён палякаў, то па перапісу 1921 года аказалася украінцаў 3,8 мільёнаў, а лік «палякаў» узрос з 1 мільёна да 3.190 тыс.

Нашы совецкія статыстыкі дакладна ўлічаць усе нацыянальнасці незалежна ад таго, у якой частцы Совецкага Саюза яны пражываюць. Адказы запісваюцца толькі па свабоднаму вызначэнню саміх апытваемых, прычым запіс павінен быць зусім дакладным і аб'ектыўным.

Два пытанні з лістка ўсесаюзнага перапісу насельніцтва — аб нацыянальнасці і роднай мове — дадуць магчымасць адлюстраваць вялікія працэсы адраджэння і ўсебаковага развіцця нацыянальнасцей у СССР.

У Совецкай краіне самы змест, які ўкладваецца ў пытанні нацыянальнасці і роднай мовы, прынцыпова адрозніваецца ад іх зместу ў праграмах перапісаў у буржуазных краінах.

Вось што сказана аб гэтых пытаннях у інструкцыі да запаўнення перапіснога ліста, зацверджанай урадам СССР: «Запісваць нацыянальнасць, да якой адносіць сябе апытваемы», «Запісваць назву мовы, якую сам апытваемы лічыць сваёй роднай мовай».

Капіталісты нацкоўваюць адзін народ на другі, распальваюць расавую і нацыянальную нянавісць; асабліва адзначаюцца ў гэтым германскія фашысты. Яны займаюцца вылічэннем процанту арыйскай крыві ў таго або іншага германскага грамадзяніна. Яны пазбаўляюць неарыйцаў усіх грамадзянскіх правоў. Пры перапісах насельніцтва германскія фашысты дашукваюцца, якой расы чалавек, хто ён «па крыві».

У нас нацыянальнасць устанаўліваецца не па прызнаку паходжання, не «па крыві», не па «расавых прызнаках». Мы прадстаўляем кожнаму грамадзяніну Совецкага Саюза права вызначыць сваю нацыянальнасць, выходзячы з культуры, умоў, традыцый, у якіх выхоўваўся даны чалавек.

Таварыш Сталін так вызначае паняцце нацыі: «Нацыя — гэта гістарычна склаўшаяся, устойлівая агульнасць мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця і псіхічнага складу, які праяўляецца ў агульнасці культуры». Таварыш Сталін асабліва падкрэслівае, што «Нацыя — не расавая і не племенная, а гістарычна склаўшаяся агульнасць людзей».

У адпаведнасці з ленінска-сталінскім разуменнем пытання аб нацыі, інструкцыя аб перапісу прадстаўляе кожнаму грамадзяніну права рашаць, да якой нацыі яго трэба аднесці.

У радзе выпадкаў нацыя, зразумела, можа не супадаць з паходжаннем. Вось адзін з многіх прыкладаў. Жыве, напрыклад, рускі чалавек у Беларусі на працягу многіх год, беларускую мову ведае лепш рускай, зрадніўся з беларускай культурай, чытае, піша, пераняў звычаі і традыцыі беларусаў. Ён можа з поўным правам сябе назваць беларусом.

За дзяцей, якія самі яшчэ не могуць даць адказаў на гэта пытанне, адказваюць іх бацькі. Яны-ж павінны рашаць пытанне аб нацыянальнасці сваіх дзяцей і ў тым выпадку, калі бацькі розных нацыянальнасцей. К прыкладу, як быць, калі бацька — беларус, матка — яўрэйка? У такім выпадку пытанне аб нацыянальнасці дзяцей рашаюць іх бацькі.

Многія думаюць, што нацыянальнасць і родная мова павінны заўсёды супадаць, што гэта адно і тое-ж. Гэта, зразумела, няверна. Родная мова не абавязкова павінна супадаць з нацыянальнасцю. І пытанне аб роднай мове пры перапісу насельніцтва, таксама як і нацыянальнасць, запісваецца па самавызначэнню кожнага грамадзяніна.

Перапіс дасць багаты лічбовы матэрыял, характарызуючы найвялікшы росквіт нацыянальных па форме, соцыялістычных па зместу культур усіх нацыянальнасцей, нацыянальных груп і народаў нашай вялікай радзімы.

Н. Н.

21 снежня менскі гарком КП(б)Б і горсавет склікалі агульнагарадскую нараду ўсіх перапісных работнікаў Менска. НА ЗДЫМКУ: у зале нарады.

ПЯТЫ ПУНКТ ПЕРАПІСНАГА ЛІСТА

У пятым пункце перапіснога ліста стаіць пытанне аб рэлігіі. Гэты пункт мае велізарнае палітычнае значэнне.

У капіталістычных краінах прыналежнасць да рэлігіі пры перапісах вызначаецца механічна, фармальна, у залежнасці ад таго, да якой царквы прышчэпан, які рэлігійны абрад быў зроблен над даным чалавекам у дзяцінстве. Калі, скажам, быў хрышчоны, яго далучаюць да «хрысціян», незалежна ад сапраўдных перакананняў апытваемага, ад таго верыць ён зараз ці не верыць.

Царскі ўрад, праводзячы перапіс насельніцтва ў 1897 годзе (дарэчы, адзіны перапіс за ўвесь дарэволюцыйны час), не атрымаў больш-менш правільных вестак аб складзе насельніцтва і ў прыватнасці аб рэлігіі. Насельніцтва, якое прытрымлівалася іншых веравызнанняў апрача праваслаўнага, усяляк праследвалася. Таму вельмі многія давалі аб сабе заведама няправільныя даныя аб веравызнанні.

Пролетарская рэволюцыя, буйны росквіт соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР зусім змяніў твар нашай радзімы. Непазнавальнымі сталі людзі краіны Советаў. Бескультур'е, непісьменнасць, сляпая вера ў бога, у святых, у розныя забабоны адступілі перад светлым, рэальным жыццём. У нашай краіне амаль ліквідавана непісьменнасць — гэта праклятая спадчына царызма. З кожным днём расце культурны ўзровень працоўных. Толькі як выключную рэдкасць можна сустрэць зараз маладога грамадзяніна, абытанага яшчэ павуціннем рэлігійнага дурману.

Перамога калгаснага ладу з'явілася магнейшым ударам па рэлігіі, якая знаходзіла сабе спрыяючую глебу, галоўным чынам у адсталым дробнаўласніцкім сялянскім асяроддзі. Не дарма папы, ксяндзы і ўсё духавенства — гэтыя «прадстаўнікі бога на зямлі»—так шалёна агітавалі і прадаўжаюць агітаваць супроць калектывізацыі, бачучы ў гэтым сваю пагібель.

Совецкі ўрад ніколі не праследваў за рэлігійныя перакананні, за адпраўленне рэлігійных абрадаў.

«Мы вядзем прапаганду і будзем весці прапаганду супроць рэлігійных прадрассудкаў. Законадаўства краіны такое, што кожны грамадзянін мае права спаведваць усякую рэлігію. Гэта справа сумлення кожнага. Іменна таму і правялі мы аддзяленне царквы ад дзяржавы. Але правёўшы аддзяленне царквы ад дзяржавы і праваслаўшы свабоду веравызнання, мы разам з тым захавалі за кожным грамадзянінам права змагацца шляхам перакананння, шляхам прапаганды і агітацыі супроць той або іншай рэлігіі, супроць усякай рэлігіі». (Сталін).

Гэтыя сталінскія словы адлюстраваны ў 124 артыкуле толькі-што прынятай Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў Сталінскай Канстытуцыі, якая прызнае за ўсімі грамадзянамі свабоду правіць рэлігійныя культы і свабоду антырэлігійнай прапаганды.

Перапіс насельніцтва Саюза ССР 1937 года павінен будзе паказаць нашы сапраўдныя поспехі ў перамаганні рэлігійных прадрассудкаў, якія з'яўляюцца найбольш распаўсюджаным перажыткам капіталізма ў свядомасці людзей.

Правільныя весткі аб колькасці веруючых і няверуючых, аб прыналежнасці да таго ці іншага веравызнання будуць залежаць у значнай ступені як ад правільна пастаўленага шчотчыкам пытання, так і ад правільнага адказу апытваемага. Таму кожны шчотчык павінен ведаць, якую мэту мае гэта пытанне. Ён павінен зразумець, што справа ідзе не аб фармальнай прыналежнасці грамадзяніна да таго ці іншага веравызнання ў мінулым, а аб яго цяперашніх перакананнях.

Прадставім сабе такі выпадак. Шчотчык запаўняючы перапісны ліст фармальна задае пытанне: «Якой вы рэлігіі?» На такое пытанне ён можа атрымаць не толькі недакладны, але проста супярэчлівы сапраўднасці адказ, бо апытваемы можа не разабрацца і падумаць, што справа ідзе аб тым, да якога веравызнання афіцыяльна належалі яго бацькі і ён сам у дзяцінстве. І тады ён можа не гледзячы на тое, што даўно перастаў верыць, адказаць не па сутнасці.

Таму шчотчык павінен раней за ўсё растлумачыць апытваемаму сэнс пытання і высветліць веруючы ці няверуючы даны грамадзянін. Калі няверуючы, дык у графе «рэлігія» так і трэба запісаць «няверуючы». Калі-ж апытваемы з'яўляецца веруючым, тады шчотчык павінен высветліць, да якога іменна веравызнання гэты грамадзянін сябе прылічае (праваслаўнага, лютэранскага, іудзейскага і інш.). Толькі такім чынам мы зможам атрымаць правільныя даныя аб колькасці веруючых і няверуючых грамадзян нашай краіны.

Няма сумнення, што астаткі класаварожых элементаў паспрабуюць скарыстаць перапіс насельніцтва для сваіх інтарэсаў, для сваёй антысовецкай агітацыі. Пры гэтым яны асабліва пастараюцца ўплываць на найбольш адсталыя групы насельніцтва, якія яшчэ не пазбавіліся рэлігійных, фанатычных забабон. Трэба таксама ўлічыць, што падрыхтоўка да перапісу і сам перапіс супадае з рэлігійным святам — калядамі і інш.

Папы і сектанты ў гэтыя дні асабліва актыўна будуць распаўсюджваць свае мракабесніцкія пропаведзі. Класавы вораг будзе імкнуцца ўсяляк перашкодзіць паспяховаму правядзенню перапісу, атрыманню дакладных адказаў на пастаўленыя ў перапісным лістку пытанні, скарыстоўваючы для гэтага рэлігійныя святы.

Задача ўсіх партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый — выкрыць манеўры класавых ворагаў, супроцьпаставіць яго контррэволюцыйным пропаведзям нашу антырэлігійную прапаганду, якая заклікае людзей да новых перамог у барацьбе за заможнае і культурнае жыццё, за яшчэ большае ўмацаванне абарозназдольнасці нашай радзімы.

Р. ДОДЗІН.
С. ГАЛКІН.

АБ ПАПЯРЭДНІМ АПЫТАННІ НАСЕЛЬНІЦТВА

У арганізацыі і парадку правядзення перапісу 1937 года ёсць тры перыяды: папярэдняе запаўненне перапісных лістоў (з 1 студзеня па 5 студзеня), самы перапіс (6 студзеня з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы) і кантрольныя абходы (з 7 па 11 студзеня).

Чым выклікаецца неабходнасць папярэдняга запаўнення перапісных лістоў?

Агульнавядома, што чым хутчэй праводзіцца перапіс, тым ён дакладней. Таму для правядзення перапісу па ўсяму Совецкаму Саюзу ўрад устанавіў адзін дзень, а іменна—6 студзеня 1937 года.

Для таго, каб забяспечыць правядзенне перапісу ў адзін дзень, поўны ахоп усяго насельніцтва і высокую якасць запаўнення перапісных лістоў і ўведзена папярэдняе запаўненне.

Час з 1 па 5 студзеня павінен быць выкарыстан як шчотчыкамі, кантралёрамі і іншым кіруючым персаналам перапісу, так і ўсім насельніцтвам для ўсебаковай падрыхтоўкі да перапісу. У гэты перыяд шчотчык павінен абыйсці ўсе дамы свайго ўчастка і папярэдне запоўніць на кожнага грамадзяніна ўсе пытанні перапіснога ліста. Можа аказацца, што шчотчык, прыйшоўшы на кватэру, не застане ўсіх пражываючых там грамадзян. У гэтым выпадку ён запаўняе перапісны ліст на асоб, аказаўшыхся на месцы і ўмаўляецца з імі, калі ён прыйдзе ў другі раз (паміж 1 і 5 студзеня), каб запоўніць перапісныя лісты на астатніх.

Шчотчык не мае права ў часе папярэдняга абходу запаўняць перапісны ліст завочна, апрача малых дзяцей, за якіх адказы на пытанні даюць бацькі. Ён абавязан адказы на пытанні запісваць толькі пры асабістым апытанні грамадзян. Апрача таго гэты перыяд павінен быць максімальна выкарыстан шчотчыкам, кантралёрам, брыгадамі салдэйнасці пры сельсоветах, жактах для ўстанаўлення — ці не прапушчаны якія-небудзь пункты (старожкі, будкі шасейныя, чыгуначныя і пункты сезоннага характару), а таксама для растлумачэння насельніцтву задач перапісу.

ПІЛЬНА ЗАХОЎВАЦЬ МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРАПІСУ

Адказы на пытанні перапіснога ліста асобных грамадзян не падлягаюць разгалошванню. Урад устанавіў, што за разгалошванне даных, занесеных у перапісны ліст аб асобных грамадзянах, вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасці.

Даныя матэрыялаў перапісу прадстаўляюць сабой вялікую каштоўнасць, маючую велізарнае палітычнае і народна-гаспадарчае значэнне. Класавы вораг напрабуе напакасціць нам. Іменна таму неабходна арганізаваць вельмі пільнае захоўванне перапісных матэрыялаў.

Перапісны ліст з моманту яго запаўнення толькі пачынае сваё «падарожжа». Да канчатковага яго скарыстання яму прастаіць прарабіць вялікае кола і падвергнуцца дакладнай і падрабязнай апрацоўцы. Дастаткова ўказаць, што перапісны ліст з моманту яго запаўнення да сканчэння толькі пярвічнай апрацоўкі, г. зн. да паступлення на ўчотную машыну, будзе перахоўзіць з рук у рукі мінімум 30 разоў.

Усё гэта абавязвае арганізаваць такія беражлівыя адносіны і захоўванне перапіснога ліста і іншых перапісных дакументаў, якое забяспечыла-б магчымасць поўнага скарыстання багацейшых даных перапісу і папярэдзіць усякія магчымасці прапажы і раскрадання іх.

С. Ш.

РАШУЧА ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ АПАРАТА СУВЯЗІ

Бурнае развіццё соцыялістычнай гаспадаркі і няўхільны рост культурнага ўзроўню працоўных нашай краіны прад'яўляюць усё большыя і большыя патрабаванні да апарата сувязі. Наша партыя і ўрад аддаюць велізарную ўвагу органам сувязі, як аднаму з важнейшых нерваў народнай гаспадаркі. Даволі ўпамянуць, што па чале Наркамата сувязі партыя паставіла такіх выпрабаваных большэвікоў як тт. Ягода і Пракоф'еў.

Былое кіраўніцтва Наркамсувязі ў асобе Рыкава не здолела выканаць пастаўленыя перад ім задачы. Апарат сувязі—найбольш вузкае месца ва ўсёй сістэме народнай гаспадаркі. Асабліва адсталым участкам з'яўляецца паштовая сувязь.

Якасць паштовай сувязі залежыць у значнай ступені ад падрыхтаванасці, граматнасці і свядомых адносін да працы работнікаў гэтага апарата. Між тым былое кіраўніцтва Наркамсувязі не аддавала ўвагі пытанням падрыхтоўкі кадраў паштовых работнікаў і належнага іх выхавання, таксама як не звяртала ўвагі на кантроль за работай пошты на мясцах. Гэта прывяло да масавага патоку зусім законных скарг працоўных на агідную работу пошты, дзе страты і раскрадання каштоўнасцей і прапажа карэспандэнцый і выданняў друку стала звычайным з'явішчам.

Па даручэнню ЦК ВКП(б) і Наркамсувязі мы правялі абследванне работы паштовай сувязі ў БССР. Прыходзіцца канстатаваць, што гэты ўчастак народнай гаспадаркі знаходзіцца далёка не на належнай вышыні. Мы сустрэліся з вапіючымі фактамі бюракратычных, напляваньскіх адносін работнікаў пошты да запатрабаванняў кліентуры, да скарг працоўных.

Нізкая якасць работы з'яўляецца рэзультатам дрэннай падрыхтаванасці кадраў, адсутнасці культурна абсталяваных памяшканняў, нездавальняючых культурна-бытавых умоў работнікаў сувязі. А самае галоўнае гэта — адсутнасць штодзённага апаратыўнага кіраўніцтва органамі сувязі на мясцах з боку Беларускага кіраўніцтва сувязі.

Зварачае на сябе ўвагу таксама амаль поўнае самаўхіленне асобных горсоветаў і райвыканкомаў ад кантролю і дапамогі органам сувязі ў справе размяшчэння паштовай сеткі, стварэння неабходных умоў для нармальнага абслугоўвання насельніцтва.

Праверкай былі ахоплены Чэрвеньскі і Гомельскі раёны, Мозырская акруга, менскі паштамт і гаралскія аддзяленні сувязі сталіны БССР. Пачнем з менскага паштамта. Як сталічны, ён павінен быў-бы служыць прыкладам узорнага абслугоўвання насельніцтва для ўсіх паштовых аддзяленняў сувязі БССР. На справе-ж ён ніяк не можа з'яўляцца школай для іншых, бо тут маюць месца факты агіднай работы.

Апарат менскага паштамта адрозніваецца сваімі грубымі адносінамі да кліентуры. Дастаткова азнаёміцца з кнігай скарг, каб у гэтым пераканацца. У кнізе запісана 16 скарг на грубасць работнікаў паштамта Пракаповіч, Кашпяровіч, Швеняка і Пакасечнай. Характэрна, што дырэкцыя паштамта не звяртае ніякай увагі на гэтыя скаргі, не прымае мер у адносінах да названых вышэй работнікаў. Яны па-ранейшаму прапягваюць здзеквацца над кліентурай.

10 тысяч скарг паступіла за год на дрэнную дастаўку пісем, газет і журналаў, на прапажу заказных карэспандэнцый, пасылак і грашовых пераводаў. Гэта ганебная лічба з'яўляецца цяжкім абвінавачэннем менскаму паштамту. Але самае абураючае гэта — тое, што скаргі кліентуры застаюцца без увагі і рэагавання. Вось для прыкладу скарга на згублены перавод № 119/1 на імя Рахліна ад 4 студзеня 1936 года. Скарга ляжыць ужо цэлы год, а бюракраты з паштамта не ўдасужыліся разабрацца яе.

Або вось другая скарга — грамадзянкі Сарокінай на згублены перавод, адасаваны ў паштовае аддзяленне Батаеўка, Хоцімскага раёна БССР. Гэта скарга таксама ляжыць каля году без рэзультата. Дырэктара паштамта т. Кадушына, відаць, зусім не турбуе, што на пошце ляжаць 210 такіх не разгледжаных скарг (да моманту абследвання). Не турбуе гэта і начальніка Беларускага кіраўніцтва сувязі т. Валодзька, які не можа не ведаць аб гэтым агідным факце, бо менскі паштамт знаходзіцца не дзе-небудзь за гарамі, а ў адным горадзе з Беларускім кіраўніцтвам сувязі.

Заказныя цісьмы прымаюцца на паштамце механічна, работнікі не звяртаюць увагі на правільнасць адрасоў на канвертах. Ёсць выпадкі прыёму пісем, адасаваных у неіснуючыя гарады. 5 снежня, напрыклад, касір Лабанава прыняла заказное пісьмо, адасаванае на... станцыю Пошта (?). Касір Варашова 8 снежня прыняла заказное пісьмо ў горад Харкавіцк (?). Такія пісьмы, зразумела, прападаюць. Гэта замест таго, каб касір своечасова папярэдзіў адправіцеля і разам з ім выправіў адрас.

Дастаўка пасылак на дом адрасатам у Менску не практыкуецца, хоць гэты культурны метад абслугоўвання насельніцтва існуе даўно не толькі ў рэспубліканскіх і абласных, але нават ва многіх раённых цэнтрах СССР і БССР. Сталічнаму менскаму паштамту проста не дазвольна пазбаўляць працоўных элементарных выгод культурнага абслугоўвання. Смешна і непрыгожа гучаць спасылкі кіраўнікоў паштамта на адсутнасць транспартных сродкаў!

Тэлеграфныя пераводы дастаўляюцца толькі адзін раз у суткі. Перавод па тэлеграфу, паступіўшы ў другой палове дня, дастаўляецца адрасату толькі на наступны дзень, што з'яўляецца грубым парушэннем устаноўленых правіл і пагардай да інтарэсаў кліентуры.

Кантрольныя тэрміны дастаўкі друку на працягу года сістэматычна парушаліся і дырэкцыя паштамта вымушана была заплаціць штраф агульнавядзенаму кантрольнаму пасту ў суме звыш 13 тыс. руб.

Бесперапынная цякучасць апарата паштамта даходзіць да нечуваных памераў. За 11 месяцаў з 406 работнікаў паштамта зволіліся 374 чал. Іншымі словамі, амаль увесь штат абнавіўся. Гэта яшчэ адно цяжкае абвінавачванне дырэкцыі паштамта і Беларускаму кіраўніцтву сувязі. Яны не забяспечваюць належных умоў работнікам апарата, не вядуць барацьбы з цякучасцю.

У апараце паштамта развалена працоўная дысцыпліна. Дырэкцыя і мясцом замест масава-выхаваўчай работы дзейнічаюць голым адміністраваннем. Даволі сказаць, што за 11 месяцаў з 406 работнікаў падвергнуліся дысцыплінарным спагнанням 211 чал., гэта значыць больш паловы штата. У апараце прапявтае зажым самакрытыкі, культывуецца падхалімства да «начальства» і грубыя адносіны да падначаленых. Дырэктар Кадушын у сваіх абыходжаннях з работнікамі сам ужывае грубасці і пагрозы накшталт «вышвырну вон» і т. п.

Не малая доля віны падае і на менскі гарадскі совет, які не аказвае дапамогі паштамту ў справе забеспячэння работнікаў сувязі, асабліва пізка аплачваемых, інтэрнатамі. Больш таго, горсовет забраў памяшканне інтэрната работнікаў сувязі па Комсамольскай вуліцы і да гэтага часу не прадаставіў у замен другога памяшкання.

Зусім недапушчальная вакханалія існуе на паштамце ў сістэме аплаты працы. Без усякіх падстаў дырэкцыя паштамта заніжала зарплату вытворчым работнікам і за гэты кошт павысіла стаўкі кіруючым работнікам. Гэта прамое парушэнне закона з'яўляецца таксама адной з прычын цякучасці апарата. З фондам зарплаты на паштамце наогул справа абстаіць не зусім добра. У выніку дрэннай арганізацыі працы дырэкцыя дапусціла перавыдаткаванне гэтага фонда ў суме 23 тыс. руб.

Не лепшае становішча і ў гарадскіх аддзяленнях сувязі. Памяшканні апошніх цесныя, не абсталяваныя, абслугоўванне кліентуры з рук вон дрэннае. Узяць, напрыклад, чапвертае аддзяленне па Ракаўскай вуліцы. Яно знаходзіцца ў памяшканні, плошча якога роўна 16 кв. метрам. Хіба магчыма тут культурнае абслугоўванне насельніцтва? Між тым менскі горсовет да гэтага часу не дае другога памяшкання, абмяжоўваючыся толькі абяцаннямі.

У новым доме спецыялістаў па Совецкай вуліцы яшчэ пры закладцы яго было запраектавана памяшканне пад аддзяленне сувязі. Аднак, калі будаўніцтва было закончана, горсовет у асобе старшыні т. Жуковіча замест паштовага аддзялення, якое павінна было культурна абслугоўваць спецыялістаў і балей усю Камароўку, размясціў тут архітэктурна-планіровачнае кіраўніцтва.

Наколькі менскі горсовет не цікавіцца работай пошты сведчыць і наступны факт. 120 пісьманосцаў падалі заяву ў горсовет аб перайменаванні аднаіменных вуліц, устанаўленні правільнай нумарацыі дамоў, асвятленні пад'ездаў і лесніц і вывешванні спісаў жыхароў. Гэту заяву горсовет пакінуў без усякай увагі. Пісьманосны былі прымушаны звярнуцца са скаргай у Камісію Совецкага Кантроля.

Факты ігнаравання інтарэсаў працоўных наглядаюцца і ў Гомелі. У буйным прамысловым цэнтры, дзе налічваецца 160 тыс. насельніцтва, ёсць усяго 2 паштовыя аддзяленні. Працоўным прыходзіцца хадзіць за атрыманнем і здачай пасылак і пераводаў за 3—4 кілометры. Ужо адзін гэты факт гаворыць досыць ярка аб «клапатлівых» гаспадарах горада Гомеля і аб «паваротлівасці» Беларускага кіраўніцтва сувязі.

Становішча паштовай сувязі ў Чэрвеньскім раёне можна ахарактарызаваць некалькімі фактамі. На чэрвеньскай пошце вы не знойдзеце нават ручкі і пяра, каб напісаць пісьмо. Мясцовы ўрач аднойчы ў кнізе скарг папракнуў у гэтым работнікаў пошты. Праз некаторы час у кнізе з'явіўся адказ намесніка начальніка раённага аддзела сувязі Міркіна аб тым, што «ручкі нехта крадзе» і што ён просіць урача злавіць злодзея(!?).

Калі адзін кліент паскардзіўся на тое, што не можа атрымаць грошай па пераводу на працягу 5 дзён, ён атрымаў адказ ад таго-ж Міркіна: «Начальніка не было, а я ўязджаў дамоў на 5 дзён. Не было каму падпісаць чэкі, таму грошы па пераводу не выплачваліся». Далей ні патрэбны каментарыі да гэтага «тлумачэння»! Другая разноска карэспандэнцкай у Чэрвені не робіцца, пісьманосны чамусьці працуюць толькі 4 гадзіны ў дзень.

Ёсць у БССР і лепшыя прадпрыемствы сувязі. Да такіх можна аднесці першае гаралское аддзяленне ў Менску (начальнік т. Мялешка), мозырскі райаддзел сувязі, якія не маюць скарг на дрэннае абслугоўванне кліентуры і дзе вытворчы працэс пастаўлен больш-менш здавальняюча. Але такія прадпрыемствы налічваюцца адзінкамі.

Наша шчаслівая краіна, якая толькі што прыняла Сталінскую Канстытуцыю — гэту вялікую хартыю вызваленага чалавецтва, выражаючую выключныя сталінскія клопаты аб працоўных, павінна мець самую перадавую, самую гібкую гаспадарку сувязі.

Беларускае кіраўніцтва сувязі і ў першую чаргу ўпаўнаважаны Наркамсувязі па БССР т. Валодзька павінны, нарэшце, зразумець, што партыя і ўрад не пацерпяць далей коснасці, бюракратызма, безгаспадарчасці на такім важнейшым участку, як апарат сувязі. Пара рашуча перабудаваць работу!

Вывады павінны таксама зрабіць і мясцовыя кіруючыя арганізацыі, у першую чаргу горсоветы і райвыканкомы. Яны абавязаны павярнуцца тварам да апарата сувязі, узяць пад свой кантроль яго работу і забяспечыць сапраўды культурнае абслугоўванне насельніцтва.

А. А. ПАГОЖАЎ,
упаўнаважаны ЦК ВКП(б) і Наркамсувязі СССР па праверцы работы органаў сувязі БССР.

ПРАЦОЎНЫЯ БССР АБУРАНЫ БАНДЫЦКІМ НАПАДАМ ФАШЫСЦКІХ МЯЦЕЖНІКАЎ НА ЦЕПЛАХОД „КОМСОМОЛ"

Бура народнага гневу

З усіх канцоў Совецкай Беларусі нясецца бура народнага гневу. Працоўныя ў сваіх рэзалюцыях, прынятых на мітынгах пратэстаў просяць совецкі ўрад прыняпуць да суровай адказнасці фашысцкіх бандытаў, просяць паслаць эскадру ў іспанскія воды для аховы совецкіх суднаў. Адначасова працоўныя ўносяць сродкі на пабудову магутнага морскага флота, новых магутных цеплаходаў на змену загінуўшага ад рукі фашысцкіх бандытаў цеплахода «Комсомол».

300 удзельнікаў раённай нарады па перапісу насельніцтва (Чэрвеньскі раён) просяць совецкі ўрад прыняць самыя рашучыя меры да фашысцкіх бандытаў. «Замест патопленага цеплахода «Комсомол» пабудуем дзесяткі новых, яшчэ больш магутных караблёў, — пішуць яны ў рэзалюцыі. — Уносім у фонд пабудовы 1500 руб».

Стаханавец полацкай сельска-гаспадарчай арцелі імя 15 гадавіны Кастрычніка тав. Эфінгоф, выступіўшы на мітынгу заявіў: «Мы да глыбіні душы абураны нападам і патапленнем фашысцкімі мяцежнікамі нашага цеплахода «Комсомол». Няхай ведаюць фашысцкія бандыты, што ім гэта не пройдзе дарма. Совецкі народ зможа абараніць свой флот, сваю мірную працу, сваю любімую радзіму». Па прапанове тав. Эфінгофа рабочыя майстэрні пастанавілі адлічыць 1 процант са свайго месячнага заработку ў фонд пабудовы магутнага морскага флота.

«Фашысты правакуюць новую бойню,— пішуць ў сваёй рэзалюцыі работнікі цэнтральнага архіўнага кіраўніцтва БССР і менскага аддзялення дзяржархіва, — але няхай яны не думаюць, што іх злачынствы застануцца беспакаранымі. Сіла і магутнасць Совецкага Саюза, гарачая любоў працоўных да сваёй радзімы, адлапасць справе партыі Леніна—Сталіна—непахісны».

Работнікі цэнтральнага архіўнага кіраўніцтва БССР і менскага аддзялення дзяржархіваў вітаюць прапанову рабочых балтыйскага судна-будаўнічага завода імя Орджанікідзе і прапанову работніц «Трохгоркі» аб зборы сродкаў на будаўніцтва новых совецкіх караблёў. У фонд пабудовы яны аллічваюць аднадзенны заработак.

Калектыў навуковых работнікаў гомельскага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі на мітынгу пратэста пастанавіў арганізаваць гурток па вывучэнню аўтамабільных і авіяцыйных матораў, каб ва ўсякую мінуту быць гатовымі да абароны сваёй радзімы.

50 процантаў свайго дзённага заработку ў фонд пабудовы новых караблёў адлічылі работнікі ўздзенскага леспрамгаса. 16 настаўнікаў магільнянскай школы гэтага-ж раёна просяць урад дазволіць збор сродкаў на пабудову новых совецкіх крэйсераў.

Гнеў і абурэнне калгаснікаў

ПОЛАЦК. На прадпрыемствах і ў калгасах округі адбываюцца шматлікія мітынгі пратэсту супроць зверстваў фашысцкіх мяцежнікаў, якія патапілі наш цеплаход «Комсомол».

На мітынгу калгаснікаў арцелі імя Леніна, Надкага сельсовета, Ветрынскага раёна, выступіў калгаснік Каланта Аўхім:

— Раней самым лютым зверам на зямлі лічыліся тыгры, фашысты сваёй лютасцю пераўзышлі іх, — гаворыць ён. — Народы Совецкага Саюза не могуць і не павінны дараваць фашыстам патапленне совецкага цеплахода.

— Хай фашызм не думае, што яму ўдасна вымыць свае подлыя рукі ў крыві совецкага народу, — заявіў 70-гадовы калгаснік Воўкаў Нікіфар на мітынгу ў сельгасарцелі «Перамога».

50-гадовы калгаснік калгаса «Молат», Ветрынскага сельсовета т. Дзмітрычонка на мітынгу калгаснікаў заявіў: «На заклік нашага наркома абароны К. Е. Варашылава, я першы пайду абараняць сваю радзіму. Мы, працоўныя Совецкай краіны, нікому не дазволім таптаць совецкія судны і нападаць на совецкія рубяжы».

Такія-ж шматлікія мітынгі праходзяць па ўсіх калгасах пагранічнага Ветрынскага раёна. Вялікі гнеў і абурэнне калгаснікаў.

Б. МЕЖАРЫЦКІ.

Паслаць эскадру для аховы совецкіх караблёў

МОЗЫР. (Кар. «Звязды»). Працоўныя Палесся, як і ўвесь совецкі народ, абураны разбойніцка-бандыцкім нападам фашысцкіх піратаў на совецкі цеплаход «Комсомол». На мітынгах-пратэстах рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя аднадушна просяць совецкі ўрад прыняць самыя рашучыя меры да фашысцкіх бандытаў, каб раз і назаўсёды пакласці канец іх піратскім злачынствам.

Калектыў работнікаў мозырскай ашчадкасы просіць совецкі ўрад паслаць у іспанскія воды вайсковую эскадру для аховы нашых гандлёвых суднаў. Адначасова работнікі ашчадкасы пастанавілі адлічыць на пабудову новых суднаў у замен загінуўшага цеплахода «Комсомол» аднадзённы заработак. Такія-ж пастановы прыняты на мітынгах рабочых мозырскіх прадпрыемстваў.

Калгаснікі Палесся аднадушна падтрымліваюць прапанову рабочых буйнейшых прадпрыемстваў Саюза аб зборы сродкаў на пабудову новых совецкіх суднаў. У калгасах разгортваецца збор сродкаў.

Р. ФРАЛОЎ.

„Не здабраваць тады ворагу"

Ва ўсіх цэхах менскага завода імя Кірава ўчора адбываліся мітынгі пратэсту супроць бясчынстваў фашысцкіх піратаў, якія патапілі совецкі цеплаход «Комсомол».

У адказ на наглае выступленне фашысцкіх піратаў рабочыя завода імя Кірава прынялі рашэнне аб арганізацыі на заводзе гуртка па танкаваджэнню і абавязаліся даць лепшых рабочых у лік падрыхтоўкі 150 тысяч лётчыкаў.

І. М.

25 снежня ў менскім Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адбыўся ўрачысты выпуск курсантаў-лётчыкаў менскага аэраклуба імя Молакава, якія навучаліся без адрыву ад вытворчасці. НА ЗДЫМКУ: курсанты-выпускнікі на ўрачыстым вечары.

Фото Я. Салавейчыка.

ВЫПУСК МАЛАДЫХ ПІЛОТАЎ

25 снежня ў перапоўненай канцэртнай зале дома Чырвонай Арміі пры ўдзеле партыйных, комсамольскіх і грамадскіх арганізацый адбыўся абаронны вечар, прысвечаны выпуску пілотаў і інструктароў-лётчыкаў, падрыхтаваных без адрыву ад вытворчасці — выхаванцаў менскага аэраклуба імя Молакава.

Пад гром авацый прымаецца прапанова аб выбранні ў ганаровы прэзідыум палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышом Сталіным, а таксама т. Гікало, тт. Галадзеда, Чарвякова і Валковіча.

Урачысты вечар адкрыў помпалітаэраклуба тав. Бабчынскі. Першыя словы ён прысвячае твору Канстытуцыі любімаму Сталіну. Усе ўстаюць і доўга грымяць авацыя ў гонар бацькі народу — вялікага Сталіна. Тав. Бабчынскі расказвае аб тым, што за апошні толькі 1936 год аэраклубам выпушчана 512 планерыстаў першай і другой ступені і 63 парашутысты. Далей ён гаворыць аб людзях, стаўшых лётчыкамі. Хто яны?

Вось 21-гадовы Іван Калініч Іпатаў — у мінулым беспрытульны. Зараз Іпатаў з'яўляецца лепшым інструктарам-лётчыкам, які падрыхтаваў 18 пілотаў на «выдатна» і «добра», не маючых ні адзінай аварыі.

Пад марш у залу стройнымі радамі ўвайшлі выпускнікі. Ад імя выпускнікоў выступае тав. Зайцаў.

— Мы шчаслівы, — гаворыць ён, — што жывем у сталінскую эпоху. Мы рады і шчаслівы што атрымліваем званне абаронца квітнеючай радзімы — званне пілота. Мы ведаем гнусныя злачынствы піратаў — іспанскіх фашыстаў і іх пакравіцеляў, патапіўшых наш цеплаход «Комсомол». Мы гатовы сёння-ж уліцца ў рады нашай слаўнай Чырвонай Арміі і грудзьмі абараняць нашу радзіму.

Маладых пілотаў віталі сакратар Менскага гаркома партыі тав. **Хадасевіч**, сакратар ЦК комсамола тав. **Мазалеўская**, намеснік старшыні Асоавіяхіма палкоўнік **Данілаў** і інш.

Пад бурныя доўга незмаўкаемыя апладысменты ўсёй залы прымаецца рашэнне аб пасылцы прывітальных тэлеграм таварышу Сталіну, тав. Косарэву і тав. Гікало.

І. МІНДЭЛЬ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПУШКІНСКІХ ДЗЁН

* У комуністычным інстытуце журналістыкі імя Кірава ў Менску адбылася пушкінская канферэнцыя. Студэнты інстытута зрабілі даклады на тэмы: «Соцыяльна-палітычныя погляды Пушкіна», «Пушкін-крытык» і «Пушкін і наша сучаснасць». Апрача гэтых дакладаў, рад студэнтаў выступілі з разборам паасобных твораў вялікага рускага паэта. 29 снежня адбудзецца вечар, на якім студэнты атрымаюць прэміі за лепшыя крытычныя работы аб Пушкіне.

* Пры клубе станцыі Магілеў ва ўсіх літаратурных гуртках вывучаецца біяграфія Пушкіна, праводзіцца чытка яго твораў. Драматычны гурток клуба рыхтуе да пастаноўкі ўрыўкі з твораў Пушкіна— «Барыс Гадуноў» і «Каменны госць». Літаратурны гурток чыгуначнай беларускай сярэдняй школы арганізуе выезд у палпэфны соўгас для правядзення пушкінскага вечара.

К.

* У любаньскай поўнай сярэдняй узорнай школе створана пушкінская камісія. Намечаны да правядзення чатыры пушкінскія вечары. Арганізуецца выстаўка твораў паэта.

ДУБАВІК.

* Сіламі вучняў першай асіповіцкай сярэдняй школы ў клубе чыгуначнікаў праведзен літаратурны вечар, прысвечаны стагоддзю з дня смерці А. С. Пушкіна. Даклад аб жыцці геніяльнага паэта зрабіла вучаніца 10 класа Гірыловіч. Пасля даклада сіламі агітбрыгады чыгуначнікаў была паказана п'еса «Пустяковые дела».

ГУРЗВІЧ.

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР

Прэзідыум Акадэміі навук БССР падагуліў вынікі работы сваёй фальклорнай камісіі. У бягучым годзе фальклорная камісія, узначальваемая народным паэтам рэспублікі Якубам Коласам, правяла рад цікавых мерапрыемстваў па ажыўленню і разгортванню фальклорнай работы.

З вялікім поспехам прайшоў усебеларускі конкурс на лепшага збіральніка фальклора. Цяпер падсумураваны яго рэзультаты. У конкурсе, які праводзіўся ўпершыню ў СССР і працягваўся 7 месяцаў, прынялі ўдзел 183 чал. рабочых, калгаснікаў, настаўнікаў, студэнтаў, вучняў старэйшых класаў. За гэты час паступіла да 15 тыс. запісаў дарэвалюцыйнага і совецкага беларускага фальклора, у тым ліку звыш 700 казак і расказаў, 700 песень, 8 тыс. частушак пераважна совецкага фальклора, 2.400 прыказак, 1.500 загадак і т. д. Лепшыя запісы ўвойдуць у зборнік «Беларускі совецкі фальклор».

Конкурс выявіў велізарны інтарэс да народнай творчасці з боку ўсяго насельніцтва. Выяўлены энтузіясты-збіральнікі фальклора. Акадэмія навук паслала ім звыш 500 індывідуальных пісем.

У бягучым-жа годзе разам з секцыяй этнаграфіі праведзены дзве фальклорныя экспедыцыі — Віцебска-Лёзнянская і Чэрвеньска-Пухавіцкая. Упершыню было сур'ёзна пастаўлена збіранне песень разам з мелодыямі. У экспедыцыі прымаў удзел кампазітар Чуркін. Запісана звыш 400 мелодый народных песень і танцаў. Усяго сабрана 4 тыс. узораў калгаснага і рабочага фальклора.

Камісія пачала ўлік народных талентаў: спевакоў, баечнікаў, цымбалістаў, танцораў, майстроў мастацкай вышыўкі і т. д.

Прэзідыум Акадэміі навук вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па далейшаму развароту фальклорнай работы ў БССР. 25 удзельнікаў конкурсу на лепшага фальклярыста прэміраваны. Сярод іх калгаснік Бондараў (Магілеўскі раён), калгаснік Кудзін (Бярэзінскі раён), рабочы Ёлка (бярэзінскі бровар), настаўніца Карпіловіч (Бешанковіцкі раён) і т. д. У 1937 годзе рашана абвясціць другі ўсебеларускі конкурс на лепшага збіральніка фальклора.

Перад фальклорнай камісіяй пастаўлена як асноўная задача на 1937 год выданне да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі зборніка «Песні беларускага народу». Галоўная рэдакцыя зборніка зацверджана ў складзе прэзідэнта Акадэміі навук, акадэміка Сурта, акадэміка Коласа і акадэміка Нікольскага. У 1937 годзе выйдзе з друку зборнік «Беларускі совецкі фальклор». Будзе арганізавана новая фальклорная экспедыцыя ў Бабруйскі і Гроскі раёны з удзелам кампазітараў і мастакоў.

Пры фальклорнай камісіі ствараецца фанаграма-архіў. Для гэтай мэты набываецца ўдасканалены апарат для запісвання мелодый — фільмафон.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ВЫХАВАНЦАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ

Учора, у 11 гадзін раніцы ў менскім Палацы піонераў і окцябрат імя Гікало адкрылася ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці выхаванцаў дзіцячых дамоў.

У алімпіядзе прымаюць удзел каля 400 юных танцораў, музыкантаў, спевакоў і расказчыкаў.

У фае Палаца арганізавана выстаўка рукадзелля выхаванцаў.

Вечарам удзельнікі алімпіяды знаёміліся з Палацам піонераў, аглядалі ўсе яго пакоі і лабараторыі.

Сёння з раніцы працяг паказу мастацкай самадзейнасці.

КНІГІ Н. А. ОСТРОЎСКАГА НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МОВАХ

Нікалай Остроўскі—любімейшы пісьменнік працоўных БССР. Яго кніга «Як гартавалася сталь», выпушчаная дзяржаўным выдавецтвам Беларусі на беларускай і рускай мовах 90-тысячным тыражом, поўнасцю разышлася. Цяпер яна друкуецца на ідышскай мове. На 1937 год дзяржаўным выдавецтвам намечана выданне кніг Остроўскага «Як гартавалася сталь» і «Народжаныя бурай» на беларускай, рускай, ідышскай і польскай мовах, а таксама спецыяльным дзіцячым выданнем агульным тыражом звыш 175 тыс. экземпляраў.

Аб велізарным інтарэсе да твораў Остроўскага сведчыць такі факт. У адной толькі гарадской бібліятэцы ў Бабруйску ёсць 68 экземпляраў кнігі «Як гартавалася сталь». Яе прачыталі 1800 чалавек. З напружанай увагай чытачы чакаюць выхаду ў свет кнігі «Народжаныя бурай».

КОЛГАСНЫ ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ ТУРНІР

МОЗЫР, 23 снежня. (Кар. «Звязды»). 20—22 снежня ў Мозыры адбыўся акруговы калгасны шахматна-шашачны турнір. У ім прыняла ўдзел 5 калгасных шахматыстаў і 8 шашыстаў. Да ўдзелу ў турніры па шахматах па-за конкурсам быў дапушчан настаўнік Капаткевіцкага раёна Райхчын. Ходам турніра цікавіліся шмат працоўных горада. У зале, дзе адбываўся турнір, заўсёды прысутнічала 80—100 глядачоў.

Па шахматах першае месца заняў настаўнік Райхчын, які выйграў усе 10 партый. Другое і трэцяе месца падзялілі калгаснікі Масло Павел з калгаса «Чырвоны Кастрычнік», Тураўскага раёна, і Халадок Ахрэм з калгаса імя Чарвякова, Даманавіцкага раёна. Яны набралі па 6 ачкоў. Чацвертае месца заняў калгаснік Северанчук Іван (калгас «Чырвоны пагранічнік», Жыткавіцкага раёна), набраўшы 5,5 ачкоў.

Па шашках першае месца заняў 43-гадовы калгаснік Пабаранка Фёдар з сельгасарцелі «Комінтэрн», Даманавіцкага раёна. З 14 магчымых ачкоў ён набраў 9,5. Другое, трэцяе і чацвертае месцы падзялілі калгаснікі Булач Васіль (сельгасарцель імя Молатава, Мозырскага раёна), Кулакевіч Пярэнцій (калгас «Чырвоны пагранічнік», Жыткавіцкага раёна) і Марціновіч Майсей (калгас імя Макса Гельца, Мозырскага раёна).

Лепшыя ўдзельнікі турніра прэміраваны грашыма. На ўсебеларускі турнір вылучаны 4 шахматысты і 7 шашыстаў-калгаснікаў.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

БЕЛДЗЯРЖКІНО і МЕНГАРКОМ ЛКСМБ

ад 1 да 10 студзеня 1937 года у дні зімовых школьных канікул

У МЕНСКІХ КІНОТЭАТРАХ: „Чырвоная зорка", „Пролетарый", „Інтэрнацыянал" і ў дзіцячым кінотэатры

ПРАВОДЗЯЦЬ

ДЗІЦЯЧЫ КІНОФЕСТЫВАЛЬ

(ДЗЕННЫЯ СЕАНСЫ)

БІЛЕТЫ З 27 СНЕЖНЯ РАЗМЯРКОЎВАЮЦЦА (па школах) У КАСАХ КІНОТЭАТРАЎ ШТОДЗЕННА З 12 ДА 3 ГАДЗІН ДНЯ.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Адкрыццё зімовага сезона.

27 СНЕЖНЯ Абанемент № 1 А. Остроўскі.

ВАЎКІ І АВЕЧКІ

Каса адкрыта з 12 да 2-і з 5 да 8 гадзін вечара.

Прадаюцца пастаянныя месцы.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» «ЗАКЛЮЧЕННЫЕ»

Дзіцячы гукавы кінотэатр УДАРАМ на ЎДАР

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» «БОРЦЫ»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» КАІН І АРЦЕМ

Гукавы кінотэатр «Спартак» «КРЕСТЬЯНЕ»

ХЛЕБАФУРАЖНАЯ КАНТОРА МЕНГАРХАРЧГАНДЛЯ

Да ведама пакупнікоў!

АДКРЫТ па Ленінградскай вул. (дом ІТР)

НОВЫ ПАКАЗАЛЬНЫ ХЛЕБАБУЛАЧНЫ МАГАЗІН № 146

У магазіне ёсць пастаянна ў вялікім выбары свежыя хлебабулачныя і высокагатункавыя КАНДЗІЦЕРСКІЯ ВЫРАБЫ.

ПРЫ МАГАЗІНЕ ЕСЦЬ ГАСТРАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ

МАГАЗІН ПРЫМАЕ ПАПЯРЭДНІЯ ЗАКАЗЫ З ДАСТАЎКАЙ тавараў НА ДОМ.

ДЫРЭКЦЫЯ ХЛЕБАФУРАЖНАЙ КАНТОРЫ.

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

ПАВЕДАМЛЯЕ, што

30 СНЕЖНЯ банк праводзіць усе аперацыі,

31 СНЕЖНЯ таксама праводзяцца усе аперацыі, апрача выдаткаў па дзяржбюджэту.

1 і 2 СТУДЗЕНЯ 1937 г.

БАНК ЗАКРЫТ.

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА.

Сёння, у 6 гадзін вечара, у АЎДЫТОРЫІ № 1 ФІЗМАТА БДУ

АДБУДЗЕЦЦА

ПУБЛІЧНАЯ АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ

на ступень кандыдата матэматычных навук:

1. Навуковага работніка М. А. ЛУКОМСКАЙ: «Рашэнне алгебраічных і трансцэндэнтных ураўнення».
2. Навуковага работніка С. І. МЕЛЬНІКА: «Пласцінка на ўпругім аснаванні».

Апанент — доктар матэматычных навук прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта С. Г. МІХЛІН.

Запрашаюцца навуковыя работнікі, аспіранты і студэнты.

РЭКТАРАТ БДУ.

Да ўвагі радыёслухачоў і ўласнікаў эфірных радыёўстановак

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ,

на падставе пастановы СНК СССР № 656 ад 27/III 1934 г. і загаду НКС СССР № 202 ад 10/IV 1936 г., даводзіць да ведама ўсіх устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў і асобных грамадзян, якія маюць у сваім карыстанні

ЭФІРНЫЯ РАДЫЁПРЫЁМНІКІ,

што з 1 ліпеня 1936 г. тэрмін узносу абанементнай платы за радыёслуханне ўстаноўлен:

1. ЗА ЛЯМПАВЫЯ ПРЫЁМНІКІ два разы ў год па паўгоддзях уперад — 5 студзеня і 5 ліпеня, г. зн. за радыёпрыёмнікі:

а) індывідуальнага карыстання па 12 руб.

б) калектыўнага карыстання па 18 руб.

в) грамадскага карыстання па 25 руб. У КОЖНАЕ ПАЎГОДДЗЕ.

2. ЗА ДЭТЭКТАРНЫ РАДЫЁПРЫЁМНІК адзін плацеж у год не пазней 1 мая — 3 руб.

Абанементная плата ўносіцца ўладальнікамі эфірных установак у раённыя аддзелы сувязі ва ўстаноўлены тэрмін: за першае паўгоддзе — да 5 студзеня, за другое — да 5 ліпеня.

Пры выяўленні незарэгістраваных эфірных установак, нясвоечасова аплочаных або аплочаных не ў адпаведнай тарыфнай катэгорыі, на ўласнікаў гэтых установак, апрача спагнання платы за радыёслуханне, накладаецца штраф у памеры поўгадовага ўзносу за радыёслуханне. Штраф і абанементная плата, згодна пастановы СНК СССР № 2523 ад 21/XI 1935 г. органамі сувязі спаганяюцца ў бесспрэчным парадку па арт. 410-б ад 16/IX 1932 г. (З. З. СССР, 1932 г., № 69, арт. 410-б).

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА г. МЕНСКА

МЕНГАРАШЧА КАСА № 16

ПАВЕДАМЛЯЕ, што ў сувязі з налічэннем процантаў па ўкладах за 1936 год УСЕ АШЧАДКАСЫ г. МЕНСКА БУДУЦЬ ЗАКРЫТЫ:

31 СНЕЖНЯ з 2 гадзін дня і 1 СТУДЗЕНЯ ўвесь дзень.

2 СТУДЗЕНЯ ўсе касы будуць працаваць звычайна.

МЕНГАРАШЧАДКАСА № 16.

ЯК ГАТАВАЦЬ СТРАВЫ З КАНСЕРВАВАНАГА МЯСА

У гэтым артыкуле мы прыводзім некалькі рэцэптаў прыгатавання страў з кансерваў «тушонае мяса»; кожная гаспадыня можа, вядома, рознастайніць іх да бесканечнасці і гатаваць любыя мясныя блюды як гарачыя, так і халодныя. Неабходна толькі памятаць, прыступаючы да згатавання блюд кансерваў «тушонае мяса», што кожная банка кансерваў «тушонае мяса» вагай у 338 грам замяняе сабой 470 грам свежага парнога мяса з касцямі, г. зн. у такім выглядзе, у якім яго прадаюць у магазінах.

Кансервы «тушонае мяса», вырабляемые на заводах Галоўкансерва, захоўваюць усе каштоўныя вяшчэствы, уласцівыя свежаму мясу; банка кансерваў змяшчае 604 калорыі.

Пілаў з тушонага мяса прыгатаўляецца так:

180 грам рысу адварваюць да гатоўнасці, адкідваюць і прамываюць гарачай вадой, якой затым даюць сцячы. Прасмажваюць 50 грам тамат-пюрэ на патэльні з мясам, кладуць туды падгатоўлены рыс і добра перамешваюць, пасля гэтага змешваюць з падагрэтым мясам і даюць пракіпець.

Каб прыгатаваць з тушонага мяса рагу, абсмажваюць у масле ачышчаную бульбу 250 грам, цыбулю і карэнні морквы, пятрушкі або рэпы, змешваюць, дадаюць сок, эліты з кансерваў, вады (100 грам), прапасці, даюць пракіпець на працягу 5—10 мінут. Пасля гэтага кладуць «тушонае мяса» і ўноў падагріваюць. Гатовае рагу перакладваюць на талерку, асобна дадаюць прыправу «кетчуп».

САЮЗКАНСЕРВЗБЫТ.

Дыплом, выданы Белдзяржуніверсітэтам ад 15/X 1936 г. за № 193 на імя Лашкевіча Мечыслава Александравіча, лічыць несапраўдным, як атрыманы ашуканчым шляхам.

РЭКТАРАТ БДУ.

Уп. Галоўліта № К—5823. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. К. Д. С.